РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 САКАВІКА 2025 г. АЎТОРАК № 43 (30431)



# «УСЕ ПАВІННЫ ГЛЯДЗЕЦЬ НАПЕРАД, НА РАЗВІЦЦЁ КРАІНЫ»

**Учора ў Палацы Незалежнасці быў важны кадравы дзень. Прэзідэнт зацвердзіў склад эканамічнага і сацыяльнага блокаў новага ўрада. Амаль усе міністры засталіся на сваіх пасадах. Назначаны новы віцэ-прэм'ер. Пастаўлены новыя задачы, лейтматыў якіх — усе павінны працаваць як адзіны кулак.**

**(Працяг на 2–3-й стар.)**

# ПРАФЕСІЯ МУЖНАСЦІ І САМААХВЯРНАСЦІ

***Ветэранам, ваеннаслужачым і супрацоўнікам органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь***

*Паважаныя таварышы!*

*Віншую вас з прафесійным святам — Днём міліцыі.*

*Гэты дзень звязвае эпохі і лёсы пакаленняў — людзей, якія стаялі каля вытокаў фарміравання органаў правапарадку рэспублікі больш за стагоддзе таму, і тых, хто забяспечвае бяспеку і абарону грамадзян краіны сёння.*

*Гісторыя беларускай міліцыі, пачынаючы з першых рабоча-сялянскіх атрадаў, якія ўзялі на сябе абавязацельства забяспечваць парадак на вуліцах нашых гарадоў і вёсак, міліцыянераў, якія першыя прынялі ўдар ворага ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — гэта летапіс мужнасці і самаахвярнасці.*

*Дзякую ўсім, хто працягвае традыцыі адданага служэння закону і народу, — ветэранам і дзейным супрацоўнікам органаў унутраных спраў, ваеннаслужачым унутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь. Штодня вы супрацьстаіце злачыннасці, абараняеце правы грамадзян, часта рызыкуючы ўласнымі жыццямі. У многім дзякуючы вашаму прафесіяналізму, гатоўнасці дзейнічаць і браць на сябе адказнасць за захаванне законнасці і парадку ў грамадстве мы зберагаем у краіне мір і стабільнасць.*

*Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і новых поспехаў у службе ў імя міру і дабрабыту роднай Айчыны.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

***(Працяг тэмы на стар. 8—9)***



Фота Лізаветы ГОЛАД.

СТАЛІЧНЫ РЭГІЁН ВЫРАШЫЎ ПРАБЛЕМУ ЯМАЧНАСЦІ 7



«БЕЛАРУСЬФІЛЬМ» РАСКАЗАЎ ДЗЕЦЯМ ПРА ДЗЯРЖАЎНЫЯ СВЯТЫ І СІМВАЛЫ 12



**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X
25043

ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ

# СВАЯ ЛАЗА

## Створаны першы айчынны сорт вінаграду тэхнічнага прызначэнн «Лорэд»

Верагодна, неўзабаве ў Беларусі з'явіцца сухі вінаградны напой з уласнай сыравіны. Не «хатні» — з чарнаплодкі, з пальчаткай на слоіку, а самы сапраўдны, што не саступае смакам і якасцю традыцыйным рэцэптам.

Прынамсі, першы айчынны сорт цёмна-сіняга вінаграду тэхнічнага прызначэння «Лорэд» ужо створаны і перададзены на дзяржсортавыпрабаванне. Вядома, пацяпленне клімату (самае значнае ў Беларусі за апошнія 130 гадоў) у гэтым пытанні – у дапамогу навукоўцам. Але ў першую чаргу «Лорэд» — вынік двух дзесяцігоддзяў карпатлівай працы і сучасных метадаў селекцыі.

### НАРАДЖЭННЕ СОРТУ

Вопыт стварэння айчынных сталовых сартоў вінаграду ў Беларусі ёсць.

– У Дзяржаўным рэестры іх некалькі, у тым ліку сумесны расійска-беларускай селекцыі: «Космас», «Касманаўт», «Краса Севера», «Красуня», – пералічвае **навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства» Уладзімір УСЦІНАЎ.**

**СТАР. 11**



# «УСЕ ПАВІННЫ ГЛЯДЗЕЦЬ НАПЕРАД,

## Якія задачы кіраўнік дзяржавы паставіў перад эканамічным

**Новы рабочы тыдзень пачаўся з кадравых прызначэнняў у новы склад урада. Ці, як заўважыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, новага-старога ўрада. Некаторыя міністры атрымалі свае партфелі літаральна за некалькі месяцаў да прэзідэнцкіх выбараў, некаторыя — крыху раней, і яны працягнуць сваю работу. Як растлумачыў кіраўнік дзяржавы, гэта было зроблена для таго, каб людзі бачылі і разумелі, з кім будзе працаваць Прэзідэнт.**



Кардынальных змен у складзе ўрада ў гэты кадравы панядзелак не адбылося. Усе прызначаныя добра ведаюць свае мэты і задачы. Але працаваць новы ўрад будзе з пэўнымі асаблівасцямі, якія агучыў Прэзідэнт: «Асаблівасць заключаецца ў тым, што большую вагу ва ўрадзе будуць мець намеснікі прэм'ер-міністра». Кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на тым, што старшыня ўрада арганізоўвае работу ўрада, вядзе пасяджэнні ўрада, але ні ў якім разе не прымае нейкіх аднаасобных рашэнняў і не цісне на членаў урада, найперш на віцэ-прэм'ераў. Каб актуалізаваць задачы і акрэсліць пытанні, на якія будзе звернута асаблівая ўвага, Аляксандр Лукашэнка сабраў урад разам. Для зручнасці і больш прадметных размоў усе былі падзелены на некалькі блокаў. Асобна з кожным блокам Аляксандр Лукашэнка правёў нарады, на якіх абмеркавалі будучую работу.

### АГУЛЬНАЯ ЗАДАЧА — ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ

**Эканамічны блок урада ўзначаліць першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў.** У гэты блок таксама ўключаны Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Міністэрства па падатках і зборах, Міністэрства фінансаў, Міністэрства эканомікі, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, Дзяржаўны камітэт па маёмасці.

Асноўнай задачай гэтага блока і першага віцэ-прэм'ера асабіста Прэзідэнт назваў эканамічны рост. І тут акцэнт — на інвестыцыі. «Вы ведаеце ініцыятыву «Адзін раён — адзін праект» — гэта ініцыятыва мае сваё развіццё, яна кантралюецца непасрэдна віцэ-прэм'ерам. Я гатовы да таго, каб на аснове гэтай ініцыятывы мы бачылі новыя ідэі. Але інвестыцыі павінны нарастаць. Мы плануем, што за пяцігодку атрымаем рост інвестыцый прыкладна на трэць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу на неабходнасць працягваць рэалізацыю буйных інвестыцыйных праектаў, сярод якіх, напрыклад, Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя, індустрыяльны парк «Вялікі камень», вытворчасць легкавых аўтамабіляў і іншыя.

«Нам трэба звярнуць увагу на адток людзей з рэгіёнаў. Ні ў якім разе нельга дапускаць гэтага адтоку. Дыферэнцыяцыя ў заработнай плаце павінна быць скарочана. Людзі павінны атрымліваць заработную плату ў рэгіёнах прыкладна такую ж, як у Мінску», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

Яшчэ адна задача датычыцца безумоўнай рэалізацыі закона аб пераводзе індывідуальных прадпрымальнікаў у суб'екты малога бізнесу. «Да 2030 года сектар малога сярэдняга прадпрымальніцтва павінен фарміраваць каля паловы эканомікі», — адзначыў беларускі лідар. Ён згадаў і пра эфектыўнасць фарміравання інстытута самазанятых. «Мы вызначыліся, хто такія самазанятыя. Задача — абяленне ўсяго рынку працы. Вы павінны асабіста каардынаваць узаемадзеянне каардынацыйных інфармацыйных сістэм і цэнтралізацыю даных», — звярнуўся Прэзідэнт да віцэ-прэм'ера. Пры гэтым ён паставіў задачу вызначыцца і раздзяліць, што маецца на ўвазе пад лічбавізацыяй, інфарматызацыяй і штучным інтэлектам. «Так, трэба быць наперадзе ў гэтых кірунках, найперш у штучным інтэлекце, разумець, што гэта такое, і дакладна ўяўляць, што нам сёння трэба, а што нам сёння не трэба, без чаго мы можам абысціся», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### МАРГ: КАНТРАЛЯВАЦЬ СУАДНОСІНЫ ВІДАЎ ГАНДЛЮ

Па словах кіраўніка дзяржавы, у частцы гандлю неабходна кантраляваць суадносіны яго відаў. Гэта тэма ўжо неаднаразова абмяркоўвалася на ўзроўні Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка параіў не забываць галоўнае — ні ў якім разе не скасоўваць крамы крокавай даступнасці ва ўгоду гандлёвым сеткам ці яшчэ чамусьці. «Добра, сёння «дыктатура», мы ж проста спраўляемся з гэтымі сеткамі. А калі ўпусцім, калі не зможам? Яны будуць кіраваць краінай. Не кажучы ўжо пра спажыўцоў, якія будуць прыходзіць у гэтыя крамы, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Павінна быць нармальная канкурэнцыя, і крамы крокавай даступнасці павінны працаваць заўсёды. Трэба падтрымліваць іх, чым больш, тым лепей. І я вам скажу шчыра: трэба спыніць стварэнне новых сетак, у нас іх у Беларусі дастаткова. Але гэта задача ўрада і найперш мясцовых органаў улады». Аднак і міністру антыманапольнага рэгулявання і гандлю Артуру Карповічу нельга выпускаць яе з поля зроку.

Яшчэ адно вельмі важнае патрабаванне да сферы гандлю — прымаць дзейсныя меры па недапушчэнні рэалізацыі ў краіне няякаснай ці фальсіфікаванай прадукцыі, а таксама тавараў, атрыманых па шэрых схемах, у тым ліку і праз інтэрнэт-прастору. «Бачыце, што нешта не так, — прымайце рашэнні. Вы, акрамя таго, што міністр, маеце вялікае імя і званне — вы член урада. І вам справа павінна быць да ўсяго. Чужых пытанняў для членаў урада ў нашай краіне няма. Яны павінны займацца ўсімі пытаннямі, якія проста пад ногі трапяць», — звярнуўся Прэзідэнт да кіраўніка МАРГ, але адрасаваў гэты меседж усім вышэйшым службовым асобам.

### МІНЭКАНОМІКІ: АСЭНСАВАНА ПЛАНАВАЦЬ

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў наступную пяцігодку эканоміка павінна працаваць па дакладных планах. Па яго словах, гэтага не трэба баяцца. «А то тыя, хто нас вучыў адысці ад планаў і на волю ўсіх адпусціць, да 500 планаў (Японія, дапусцім) па розных кірунках у год складаюць. А мы сышлі, усё кінулі. А як жыць і працаваць? Нават у сям'і людзі плануюць сваё жыццё, а мы ў дзяржаве не хочам гэта рабіць», — заўважыў Прэзідэнт. Па яго словах, **міністру эканомікі Юрыю Чабатару** задачы зразумелыя. Але Прэзідэнт яшчэ раз звярнуў увагу на тое, што варта рабіць. «Трэба ўважліва вывучаць сітуацыю з інвестыцыйным кліматам у краін-суседзяў і адпаведна дзейнічаць. А што датычыцца дэбюракратызацыі і лічбавізацыі — мы аб гэтым ужо казалі. Не трэба гэтага баяцца. Там, дзе трэба проста прыбраць гэтыя бюракратычныя перашкоды, — трэба проста на гэта пайсці і зрабіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што да канца года патрэбна скласці праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2030 года. «Хацелася б, каб, абапіраючыся на той досвед, які назапашаны, мы не перапісвалі палажэнні праграмы старой і не пераносілі ў новую, а каб гэта была праграма сапраўдная і ўяўляла сабой аблічча Міністэрства эканомікі», — паставіў задачу беларускі лідар.

### МІНФІН: БЕРАГЧЫ КОЖНЫ РУБЕЛЬ

Што датычыцца Міністэрства фінансаў, то, па словах Прэзідэнта, трэба забяспечыць устойлівасць бюджэтнай сістэмы. «Тых, хто прэтэндуе на бюджэтны рубель, у нас дастаткова. Міністэрства фінансаў павінна быць жорсткім фільтрам для такіх жадаючых і ініцыятараў. Кожны рубель трэба берагчы. Трэба паставіць перад сабой жалезную задачу, што як ніколі мы павінны эканоміць у гэтай пяцігодцы. Трэба стварыць умовы для якаснай работы ўсіх бюджэтных арганізацый. І ваша задача як міністра — максімальна спрасціць і аўтаматызаваць, калі гэта трэба, іх дзейнасць», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да **міністра фінансаў Юрыя Селіверстава.**

### МІНІСТЭРСТВА ПА ПАДАТКАХ І ЗБОРАХ: НЕ БАЯЦЦА РЫЗЫКАВАЦЬ

**Міністру па падатках і зборах Дзмітрыю Кійко** трэба яшчэ раз прааналізаваць наша падатковае заканадаўства. «Я вельмі спадзяюся на вас, што вы як дасведчаны, нягледзячы на свой малады ўзрост, чалавек, які працаваў па многіх кірунках, прапануеце нейкую разумную новую сістэму. Можа, трэба і рызыкнуць. У нас краіна кіруемая. Таму, можа быць. Але не трэба ні за кім ганяцца, трэба зыходзіць з нашых умоў», — параіў Аляксандр Лукашэнка. Вельмі важнай задачай ён назваў аптымізацыю падатковых ільгот. «Наша задача — выпрацаваць такую сістэму, каб любы, хто захоча займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, проста мог разумець, якія падаткі ён павінен плаціць. А не пачынаць сваю працу кожны дзень з паходу ў падатковую інспекцыю. А так бывае ў асноўным», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

### МІНСУВЯЗІ І ІНФАРМАТЫЗАЦЫІ: РАЗУМНА ПАДЫХОДЗІЦЬ ДА ТРЭНДАЎ

**Кірыл Залескі — новы міністр сувязі і інфарматызацыі.** Да гэтага ён быў намеснікам начальніка дзяржаўнай установы «Сакратарыят Назіральнага савета Парка высокіх тэхналогій». Таму, як заўважыў Прэзідэнт, сфера для міністра не новая. «Вы, напэўна, самы прасунуты ў гэтым плане чалавек, глядзіце, што нам трэба», — звярнуўся Прэзідэнт да новага міністра. Ён параіў вельмі акуратна ставіцца да лічбавізацыі, не гнацца бяздумна за тым, што стала модным. Таксама кіраўнік дзяржавы параіў паглядзець на работу пошты: з эфектыўнасцю дзейнасці паштовай сістэмы цяпер узнікаюць праблемы.

Пасля нарады Кірыл Залескі расказаў журналістам, як плануе працаваць з «лічбай»: «Лічбавізацыя не павінна быць дзеля лічбавізацыі. Яна павінна быць для таго, каб паляпшаць эфектыўнасць нашай эканомікі і спрашчаць жыццё грамадзян. Думаю, што на гэтых асноўных кірунках мы павінны будзем сканцэнтраваць свае намаганні». Міністр звярнуў увагу, што сёння Беларусь валодае вельмі развітым IT-сектарам. «Нам трэба паглядзець, у якіх месцах нам

# НА РАЗВІЦЦЁ КРАІНЫ»

## і сацыяльным блокамі ўрада

трэба ўзмацніць карысць гэтага сектара для вырашэння нейкіх надзённых практычных задач унутры краіны. Адпаведна, у гэтым кантэксце мы і будзем выбудоўваць далейшую работу», — дадаў ён.

### ДЗЯРЖКАМІТЭТ ПА МАЁМАСЦІ: ПРАЙСЦІСЯ ПА КРАІНЕ

Для Дзяржаўнага камітэта па маёмасці задачы нязменныя. «Не сядзіце ў кабінеце, перагортваючы дакументы. Прайдзіцеся па ўсёй краіне. Тут сапраўды трэба алічбаваць, камп'ютарызаваць усё, што ў нас ёсць, выкласці ў адкрыты доступ свабодныя ўчасткі, дамы і іншае, каб людзі гэта бачылі і маглі купіць. За пяцігодку мы павінны гэту праблему зняць. У вас павінен быць улік маёмасці, зямельных рэсурсаў, участкаў канчатковы. Не павінна быць старых, разбураных не толькі дамоў, але і вёсак», — такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў перад **старшынёй камітэта Дзмітрыем Матусевічам.**

### ЭКАНАМІСТЫ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ЯК КУЛАК — РАЗАМ

Напрыканцы Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз звярнуўся да тэмы, якую абмяркоўвалі літаральна на мінулым тыдні, — сістэмы цэнаўтварэння. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ва ўсіх адказных застаецца 25 дзён, каб прывесці яе ў парадак, дапрацаваць тую, якая існуе. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што выпрацоўка механізмаў і методык — гэта найперш работа Міністэрства эканомікі. Але ўрад павінен гэту работу рэалізаваць і арганізаваць. У цэлым, па яго словах, усе задачы да эканамічнага блока ўрада цалкам зразумелыя.

«Я далёкі ад таго, што я выклаў вам выключныя патрабаванні, што гэта ўвесь аб'ём. Вы ведаеце значна больш, чым я тут казаў, і ведаеце значна больш, чым я ў сваіх галінах. Але я вам сказаў аб галоўным, на што будзе звернута мая ўвага», — падвёў вынік Прэзідэнт. Асобна ён звярнуўся да Мікалая Снапковa: «Вы за час працы ва ўрадзе сталі зусім іншым чалавекам. Таму я на вас вельмі разлічваю ў гэтым новым-старым урадзе. І спадзяюся, што мы атрымаем новы эфект».

Калі ўжо зусім канцэптуальна глядзець, то кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што, як ва ўрадзе, у Адміністрацыі Прэзідэнта будуць працаваць эканамісты. «Прэм'ер-міністр, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, кіраўнік Нацыянальнага банка — усе будуць як кулак працаваць, усе разам. Ніякага разыходжання быць не павінна. Нацыянальны банк павінен функцыянаваць фактычна ў складзе ўрада. І вы ўсе, эканамісты, павінны глядзець наперад, на развіццё краіны. Вы за гэта будзеце адказваць аднолькава. — папярэдзіў беларускі лідар. — Прэм'ер-міністр, першы віцэ-прэм'ер, кіраўнік Адміністрацыі, старшыня Нацбанка — гэта галоўныя эканамісты. Натуральна, у іх ёсць Міністэрства эканомікі, Міністэрства фінансаў, выдатныя фінансісты. Ды і ў падатковай інспекцыі ў нас хапае выдатных эканамістаў. Прыцягвайце, выпрацоўвайце рашэнні».

### «ВОСЬ ВАШ КІРУНАК — ДЗЕЙНІЧАЙЦЕ»

**Сацыяльны блок урада цяпер будзе працаваць пад кіраўніцтвам новага намесніка прэм'ер-міністра Уладзіміра Караніка.** Да гэтага ён узначальваў Гродзенскі аблвыканкам. «Дзякую вам за тое, што мне не прыйшлося прымаць валявое рашэнне. Вы пагадзіліся з маёй прапановай. Я ж ведаю, што такое быць губернатарам найлепшай у краіне вобласці, самастойным чалавекам. А тут і Прэзідэнт увесь час побач, можаш «па галаве» нечакана атрымаць, яшчэ нешта. Я ведаю, што такое быць губернатарам і што такое быць віцэ-прэм'ерам. Але я зыходзіў з таго, што ўсё ж у віцэ-прэм'ераў функцыянал будзе значна паднятым. Вось ваш кірунак — дзейнічайце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў: што яму імпануе тое, што Уладзімір Каранік



заўсёды адкрыта выказвае сваё меркаванне, не толькі ва ўрадзе, але і ў Прэзідэнта. «Вы — чалавек спраўны. Калі рашэнне прынята, вы будзеце жалезабетонна выконваць гэтае рашэнне», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён узгадаў працу Уладзіміра Караніка на пасадзе міністра аховы здароўя, якая выпала на няпросты палітычны 2020 год і пандэмію. «Прыйшлося прымаць нестандартныя рашэнні. Мы іх прымалі. Ніхто ў свеце не прымаў такіх рашэнняў, як прымалі мы. І, як сёння аказалася, мелі рацыю мы», — нагадаў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што ў сферы аховы здароўя Уладзімір Каранік — дасведчаны і таленавіты кіраўнік. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што новы віцэ-прэм'ер — адукаваны чалавек, займаўся навуковай дзейнасцю, таму гэтую сферу таксама разумее. Добра вядома, што Уладзімір Каранік адкрыты да сродкаў масавай інфармацыі.

Раней за гэты кіранак ва ўрадзе адказваў **Ігар Петрышэнка. Прэзідэнт Беларусі даў згоду на яго назначэнне на пасаду першага намесніка генеральнага сакратара Выканаўчага камітэта Садружнасці Незалежных Дзяржаў.** Не застанецца без кіраўніка і Гродзенская вобласць. **Юрый Караеў назначаны выконваючым абавязкі старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.** Адпаведны ўказ падпісаў Прэзідэнт. Гэтым жа ўказам кіраўнік дзяржавы вызваліў Юрыя Караева ад пасады памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гродзенскай вобласці. Але па даручэнні кіраўніка дзяржавы не пакіне без увагі рэгіён і Уладзімір Каранік.

### ПЯЦІГОДКА БУДЗЕ НЯПРОСТАЙ. ПАТРЭБНЫ ВЫНІК

Міністры сацыяльнага блока ўрада былі прызначаны незадоўга да прэзідэнцкіх выбараў, таму яны працягнуць сваю работу ва ўрадзе. Гэта **міністр інфармацыі Марат Маркаў, міністр адукацыі Андрэй Іванец, міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля Паўлючэнка, міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук, міністр культуры Руслан Чарнецкі, міністр аховы здароўя Аляксандр Хаджаеў.** Разам з тым Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што аванс даверу да гэтых міністраў ужо скончыўся — працаваць будзе той, хто пакажа вынік. «Гэтая пяцігодка будзе няпростай, адной гаварыльняй не абыдзешся. Патрэбны вынік», — заўважыў ён.

### МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ: СПЫНІЦЬ ХІСТАННІ

Па словах кіраўніка дзяржавы, усе міністры на сваіх месцах і выдатна ведаюць сваю сферу. «Іншая справа, што ёсць нейкія родныя, блізкія, знаёмыя. «Я лічу, што яны вельмі таленавітыя, — я цытую некаторых міністраў. — Таму яны павінны працаваць». Нягледзячы на тое, што вельмі ворагі фактычна нашай дзяржавы і сядзяць да пары да часу пад венікам. У вашай структуры такіх дастаткова. Больш, чым дзе-небудзь. Гэтага быць не павінна, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да міністра культуры Руслана Чарнецкага. — Мы перажылі з вамі гэты перыяд. Трэба ўмець даравацъ. Трэба ўмець. Калі гэта магчыма. Але калі чалавек парушыў, пераступіў закон, свядома гэта зрабіў, якое тут можа быць дараванне? Я гэта кажу ў гэтым коле, таму што ну як можна даравацъ публічным людзям? Усе публічныя людзі. І калі вы выступалі супраць дзяржавы, гэта ж бачыў увесь народ». Аляксандр Лукашэнка згадаў, як на Уладзіміра Караніка, тады яшчэ міністра аховы здароўя, «нападалі і скакалі, рвалі на ім адзенне», бо ён казаў тое, што ім не падабаецца. «Таму, Руслан, калі ў цябе там ёсць нейкія хістанні (ну, як гэта: «вось ён у кінематаграфіі можа кіно зняць, больш ніхто...»), трэба гэта спыніць. Ты — дзяржаўны чалавек. Яны павінны быць такія, як ты. Вось і ўся размова», — заявіў беларускі лідар.

### МІНСПОРТУ І ТУРЫЗМУ: ДАВАЦЬ ВЫНІК

Што датычыцца спорту, то Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на цвёрдасць, ваенную падрыхтоўку міністра Сяргея Кавальчука. Па словах Прэзідэнта, гэта нядрэнна, сёння патрэбна жорсткасць. Але ён запатрабаваў спыніць спрэчку Міністэрства спорту са старшынёй Асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» Мікалаем Шарснёвым. Адзіным шляхам да вырашэння гэтай спрэчкі кіраўнік дзяржавы назваў вынік. «Ты як спартсмен гэта добра ведаеш. Ёсць вынік — добра. Няма выніку — дрэнна. Мне шмат тут гаварылі, расказвалі, але я не бачу ў футболе пакуль выніку. Не «гараць» і іншыя віды спорту асобныя, акрамя 5-6 відаў. Не гараць. Але я хачу, каб вы разумелі, што патрэбен вынік усюды», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён папярэдзіў, што ў спорце трэба рыхтавацца да прыстойных змяненняў па зарплатах. «Гэта ж не справа, што мы за бюджэт усіх утрымліваем, — усіх за бюджэт. Якім чынам? На нерухомасць жа падатак фактычна аддалі спартсменам. А ён так утрымлівае невядома каго. Таму тут нам трэба парадак навесці», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Беларускі лідар даручыў кіраўніцтву спартыўнай галіны разабрацца, каму колькі плаціць. «А то мы сёння спрачаемся па зарплаце і іншае. Некаторыя ў нас трэнеры, якія ў плэй-оф не трапілі ў асобных відах спорту, атрымліваюць тры зарплаты Прэзідэнта. Па 35—40 тысяч рублёў. Таму ўсё трэба прывадзіць у адпаведнасць», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што тыя, хто хоча атрымліваць больш, павінны самі зарабляць гэтыя грошы, а не спадзявацца на бюджэтныя сродкі: «Ёсць вынік — ёсць грошы, зямельныя ўчасткі, кватэры і іншае. Няма выніку — размовы быць не можа».

### МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ: ДЗЕЙНІЧАЦЬ

Прэзідэнт заўважыў, што ў сістэме аховы здароўя цяпер шмат нараканняў, маўляў, не той чалавек прыйшоў. «Не будзе ніякіх там кланаў у ахове здароўя. Не будзе. Таму дзейнічайце. Калі вы будзеце павольна разгортвацца, вас будуць таптаць і аб вас выціраць ногі. І ні ён, ні я вам не дапаможам і дапамагаць не будзем, калі вы не зможаце абараніць сябе і сваіх непасрэдных падначаленых. Таму дзейнічайце. Вы назначаны Прэзідэнтам, і ніхто не мае права ў вас камяні кідаць», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да міністра аховы здароўя Аляксандра Хаджаева. Ён заўважыў, што сістэма ад фельчарска-акушэрскіх пунктаў да рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў у краіне выбудавана і павінна працаваць. Усюды абслугоўваюцца нашы людзі.

### МІНАДУКАЦЫІ: ТОЛЬКІ НЕ СПЫНЯЦЦА

У адукацыі, сродках масавай інфармацыі, па словах Прэзідэнта, адставаць нельга. Ён падкрэсліў, што адукацыю ўзначальвае малады міністр. І няхай многія на гэта скардзяцца, сфера ўжо прывыкла. «Дзейнічайце, толькі не спыняйцеся. Рабіце так, каб і ў школе было добра, каб парадак у школе быў, каб школа была храмам. І каб уступныя экзамены былі нармальнымі, даступнымі», — параіў кіраўнік дзяржавы Андрэю Іванцу.

### МІНІНФАРМ: НЕ АДСТАВАЦЬ

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што сёння сродкі масавай інфармацыі на вастрыні. Па яго словах, вельмі добра, што міністр інфармацыі Марат Маркаў працягвае сам працаваць у СМІ. «Трэба не адставаць, трэба перамагаць. Ісці, ісці наперад і перамагаць. Іншага не дадзена», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

### У тэму

Планамі і задачамі на новай пасадзе віцэ-прэм'ер Уладзімір Каранік падзяліўся з журналістамі. Асноўнай задачай ён назваў роўны доступ людзей да сацыяльных паслуг, незалежна ад месца пражывання: сталіца гэта ці невялікі населены пункт. «Роўны доступ да медыцынскай дапамогі, адукацыйных паслуг, магчымасцяў займацца спортам, да сацыяльнай дапамогі, магчымасці дакрануцца да нашай найбагацейшай культуры. Наша задача — зрабіць так, каб ад месца жыхарства грамадзяніна не залежала якасць сацыяльных паслуг, якія аказваюцца», — сказаў Уладзімір Каранік. Ён падкрэсліў, што пры прыняцці найважнейшых рашэнняў, выпрацоўцы стратэгій сацыяльны блок урада будзе ўзаемадзейнічаць з калегамі з іншых блокаў і міністэрстваў. «Сацыяльны блок залежыць ад работы рэальнага сектара эканомікі, ад фінансавання, ад магчымасцяў нашай прамысловасці. У гэтым выпадку ў сацыяльным блоку важным з'яўляецца ўзаемадзеянне з усімі органамі дзяржкiравання і з усімі ведамствамі, і я маю намер узровень гэтага ўзаемадзеяння яшчэ больш павысіць», — растлумачыў Уладзімір Каранік. Такі падыход ужо паказаў сваю эфектыўнасць. У прыклад віцэ-прэм'ер прывёў перыяд пандэміі: «Калі мяне спыталі, што дало магчымасць выстаяць сістэме аховы здароўя ў вельмі няпросты перыяд пандэміі, я адказаў, што змагалася не сістэма аховы здароўя — змагалася дзяржава. І ўсе органы дзяржкiравання былі нацэлены на вынік».

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**

*«Я не прашу вас рэгуляваць прывазную экзотыку, усякія там артышокі або авакада. Няхай гэты авакада каштуе столькі, колькі каштуе. Мая справа — забяспечыць насельніцтва той агароднінай і садавінай, якую мы здольныя і вырабляем у Беларусі. Людзям павінна быць па кішэні самае простае: капуста, цыбуля, бульба, морква, яблыкі».*

***Падчас нарады па новай сістэме рэгулявання цэн 28 лютага 2025 года.***

АКЦЭНТЫ

# СПРАВЯДЛІВАСЦЬ — У АСНОВЕ

## «Гэта не лічба з галавы»: міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю — аб прынцыпах цэнавага рэгулявання

Ці хоціць беларусам уласнай плодаагароднінная прадукцыі да новага ўраджаю, чаму вытворцам не варта гнаццa за выкананнем паказчыка па экспарце і на якіх прынцыпах павінна фарміравацца формула справядлівай цаны, у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» расказаў міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Артур КАРПОВІЧ.

### «У РАМКАХ РАЗУМНАГА ЎЗРОЎНЮ РЭНТАБЕЛЬНАСЦІ»: АБ АПТЫМІЗАЦЫІ ПАСТАНОВЫ № 713



Міністр удакладніў, што ў пытаннях цэнаўтварэння ўрад не плануе ўводзіць глабальныя змены, а дасць магчымасць аблвыканкамам і вытворцам прымаць рашэнне аб павышэнні цэн. Яно павінна зыходзіць з узроўню існуючай рэнтабельнасці на прадукцыю, якая вырабляецца за апошнія чатыры гады з улікам даведзеных паказчыкаў па ўзроўні індэкса спажывецкіх цэн для краіны на бягучы год.

— З аднаго боку, магчымы рост цэн на тавары, работы і паслугі, з другога — гэта павінна быць у рамках разумнага ўзроўню рэнтабельнасці, устаноўленага вытворцам зыходзячы з яго папярэдніх гадоў працы, а не нейкай лічбы з галавы, — падкрэсліў Артур Карповіч.

Ён дадаў:

— Цяпер, паводле пастановы Саўміна № 713 «Аб сістэме рэгулявання цэн», рэгулюецца 331 пазіцыя спажывецкіх тавараў у частцы гандлёвай, аптовай надбаўкі, — растлумачыў ён. — Разглядалася пытанне па скарачэнні пераліку гэтых тавараў або яго аптымізацыі, у тым ліку па імпартных таварах. У гэтым кірунку ўрад у найбліжэйшы час павінен разам з аблвыканкамамі, Нацыянальным статыстычным камітэтам, Камітэтам дзяржкантролю выпрацаваць узгодненае рашэнне па аптымізацыі названага пераліку, і роля пастановы № 713 працягнецца, але ўжо ў аптымізаваным варыянце.

### «БОЯЗІ НА СЁННЯ НЯМА»: АБ ЗАПАСАХ СТАБІЛІЗАЦЫЙНЫХ ФОНДАЎ

— Плодаагародніннную прадукцыю мы трымаем на асаблівым кантролі, — падкрэсліў Артур Карповіч. — Да міжсезоннага перыяду ў дзяржаве фарміруецца пэўны запас, каб не было перабояў з гэтай прадукцыяй з кастрычніка да мая, да новага ўраджаю. Два тыдні таму мы накіравалі наша галоўнае ўпраўленне сумесна з упраўленнямі гандлю і паслуг аблвыканкамаў у стабілізацыйныя фонды, каб паглядзець, як яны захоўваюцца і ў якім стане, ці дастаткова аб'ёмаў якаснай прадукцыі для таго, каб забяспечыць увесь спажывецкі рынак да канца міжсезоннага перыяду.

Па выніках праверкі зроблены адназначныя высновы: ва ўсіх рэгіёнах краіны прадукцыя захоўваецца ў належных умовах. Пэўныя «шурпатасці» з якасцю маюцца, але яны ў цэлым не ўплываюць на аб'ём гэтых запасаў.

— Таму з боку Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, упраўленняў гандлю і паслуг аблвыканкамаў якой-небудзь боязі на сёння не маецца, — сказаў на заканчэнне міністр.

Артур Карповіч таксама нагадаў, што ёсць магчымасць уводзіць меры нетарыфнага рэгулявання ў выглядзе забароны на вываз прадукцыі. Так, цяпер у краіне дзейнічае забарона на вываз прадукцыі для таго, каб забяспечыць стабільную сітуацыю на ўнутраным рынку па даступных для насельніцтва цэнах. Разам з тым, побач ёсць Расійская Федэрацыя, дзе вялікі рынак і высокі попыт. І пры наяўнасці лішку беларускую плодаагародніннную прадукцыю гатовыя забраць туды за кароткі прамежак часу.

Ён таксама падкрэсліў, што наяўнасць у дастатковай колькасці прадуктаў з баршчовага набору ў крамах і гандлёвых сетках кантралюецца МАРГ і Міністэрствам сельскай гаспадаркі практычна ў рэжыме анлайн, гэта сумесная работа. Напрыклад, калі ёсць празмернасць пэўнага віду прадукцыі і рынак стаў спажываць яе менш, уносіцца прапанова ва ўрад па адкрыцці той ці іншай пазіцыі на вываз у Расійскую Федэрацыю. Цяпер разглядаецца вываз морквы, якой у запасе з лішкам. Значыць, яе можна прапанаваць на экспарт і зарабіць валюту.

— На ўвесь міжсезонны перыяд мы заклалі больш за 121 тысячу тон плодаагародніннай прадукцыі. З іх на сёння ў нас рэшткі павінны быць па плане парадку 48 тысяч тон, аднак фактычна іх 57 тысяч тон. Гэта значыць, яшчэ запас, які мы можам прадаць на экспарт і які можна адрэгуляваць пры пастаўках на ўнутраны рынак у выпадку ўзнікнення павышанага попыту, — адзначыў Артур Карповіч.

### «НАШЫ ЛЮДЗІ НЕ ПАВІННЫ ПЕРАКРЫВАЦЬ РЭНТАБЕЛЬНАСЦЬ»: ПРА ЭКСПАРТ ПРАДУКЦЫІ

Профільны міністр нагадаў, што перад МАРГ стаіць задача пашырыць асартымент айчынных тавараў на паліцах беларускіх магазінаў, для чаго распрацоўваюцца пэўныя меры. І ў гэтых пытаннях неабходна знайсці агульныя падыходы з айчыннымі вытворцамі.

— Вытворца часта ў пагоні за выкананнем паказчыка па экспарце забывае пра ўнутраны рынак, разумеючы, што ён нікуды ад яго не дзенецца, — падкрэсліў ён. — Ёсць у нас факты, калі на ўнутраны рынак вытворцы пастаўляюць прадукцыю значна даражэй, чым прадаюць яе на экспарт. Нашы людзі не павінны перакрываць рэнтабельнасць, якую недаатрымлівае прадпрыемства на тэрыторыі замежных дзяржаў. Таму мы ўносім прапанову ўсталяваць нарматыўна, што нашы вытворцы спажывецкіх тавараў не маюць права пастаўляць сваю прадукцыю на экспарт танней, чым прадаюць яе на ўнутраным рынку. Вытворцам будзе дадзена права на вываз прадукцыі па цэнах ніжэйшых, чым яны пастаўляюць на ўнутраны рынак, аднак права будзе даваца толькі ў выключных выпадках. Для гэтага трэба будзе атрымаць узгадненне на месцах — у абласных выканаўчых камітэтах, Мінскім гарвыканкаме. У МАРГ ўпэўнены, што такія меры дадуць пэўны эфект. Аднак прынятыя бізнесам рашэнні могуць быць успрынятыя неадназначна, бо некаторыя вытворцы лічаць ўнутраны рынак прэміяльным і не саромеюцца пра гэта казаць.

На думку Артура Карповіча, не павінна складвацца сітуацыі, калі «нашы людзі са свайго кашалька плацяць за вырабленую на нашай тэрыторыі нашымі ж людзьмі прадукцыю даражэй, чым яе прадаюць у суседнюю дзяржаву».

**Па матэрыялах БелТА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ПЕНСІІ, ДАРОГІ І ЖЫЛЛЁ

## З якімі пытаннямі звярталіся да Наталлі КАЧАНАВАЙ у Барысаве



У панядзелак члены Савета Рэспублікі правялі адзіны дзень прыёму грамадзян у Мінскай вобласці. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава вяла прыём у Барысаве. Праблемы, з якімі звярталіся людзі да кіраўніка Савета Рэспублікі, самыя разнастайныя. Жыхароў цэнтральнага рэгіёна і не толькі хвалююць пытанні прызначэння пенсій, стан дарог, добраўпарадкаванне населеных пунктаў, жыллёвыя праблемы і многае іншае.

Жыхарка Барысава Аліна Пятроўна прыйшла на прыём з жыллёвым пытаннем. Яна расказала, што цягам апошніх двух гадоў рассялілі два суседнія дамы, а іхні — не. «Наш дом двухкватэрны, неўладкаваны, але яго не рассяляюць. Я там жыву з сям'ёй. Сусед не жыве», — адзначыла заяўніца.

Старшыня Барысаўскага райвыканкама Мікалай Карповіч патлумачыў, што гэта прыватная ўласнасць. Наталля Качанава ўважліва выслухала барысаўчанку і з ходу даручыла Барысаўскаму райвыканкаму і Мінскаму аблвыканкаму дадаткова вывучыць пытанне.

Крысціна Андрэеўна — шматдзетная маці. Пасля разводу з першым мужам яна жыла ў прыватным доме бацькоў, дзе была зарэгістравана. Цяпер выйшла замуж другі раз, стала шматдзетнай. «Але нас не ставяць на ўлік тых, хто мае патрэбу, бо я пагоршыла жыллёвыя ўмовы, пераехаўшы жыць да свёкра ў двухпакаёвую кватэру, — разводзіць рукамі жанчына. — У бацькоў вялікі дом. З-за гэтага я не магу скарыстацца льготамі на паляпшэнне жыллёвых умоў як шматдзетная сям'я».

Кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Таццяна Шаўцова патлумачыла, што заяўнік станавілася на чаргу як маладая сям'я і тады квадратныя метры не ўлічваліся. У другім шлюбе статус маладой сям'і быў

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

## Ігар СЕРГЯЕНКА:

# «ЗАДАЧА — ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ РЭАЛІЗАЦЫЮ КУРСА, АБАЗНАЧАНАГА ЛІДАРАМ КРАІНЫ»

## Акцэнты пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў



Пасля канкрэтных установак спікера на далейшую работу старшыні камісій праінфармавалі аб ходзе падрыхтоўкі законапраектаў, якія знаходзяцца ў Палаце прадстаўнікоў, агучылі перспектывы заканатворчай дзейнасці. Акрамя таго, дэпутаты зацвердзілі Палажэнне аб Маладзёжным савеце пры Палаце прадстаўнікоў, азнаёміліся з планам правядзення парламенцкіх чытанняў, прысвечаных 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, канкрэтызавалі прапановы мерапрыемстваў, прымеркаваных да Года добраўпарадкавання.

### У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ЗАКАНАДАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка** акцэнтаваў увагу на тым, што кіраўніком дзяржавы ў ходзе нядаўніх нарад пастаўлены шэраг задач. «У сакавіку адбудзецца чарговае пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу, дэлегатамі якога з'яўляюц-

страчаны. Па прапісцы было больш за 15 квадратаў на чалавека. А калі заяўніца зарэгістравалася па іншым адрасе, у кватэру з меншай плошчай, то такім чынам пагоршыла ўмовы.

«Сям'я шматдзетная! Трэба паляпшаць умовы і дапамагчы стаць на чаргу», — адзначыла Наталля Качанава. Шматдзетнай маме прапанавалі пакуль разгледзець арэнднае жыллё. Старшыня Савета Рэспублікі дала неабходныя даручэнні старшыні Барысаўскага райвыканкама.

Жыхарка Барысава Алена Віктараўна звярнулася з просьбай аб пераглядзе пенсіі. Паводле слоў пенсіянеркі, памер выплат не адпавядае яе 35-гадоваму стажу работы: «Я ў 2016 годзе пайшла на пенсію. Не змагла сабраць усе дакументы аб пацвярджэнні стажу і заработнай плаце. Дакументы давозіла ўжо пазней. І ўлічылі не ўсе».

Старшыня Савета Рэспублікі звязалася з **намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны Валерыем КАВАЛЬКОВЫМ.** Ён удакладніў, што барысаўчанка атрымлівае звычайную пенсію па ўзросце. Таксама дадаў, што ў жанчыны быў стаж работы ў Латвіі. Туды таксама ведамствам быў зроблены запыт, у якім адмовілі. «Але нават калі б адказ атрымалі, пенсія значна не змянілася б. Стаж работы ў Латвіі быў меншы за год. Зарплата ў заяўніцы была невялікая, таму і атрымаўся нізкі каэфіцыент пенсіі», — патлумачыў Валерый Кавалькоў.

Алена Віктараўна падала яшчэ дакументы, якія пацвярджаюць стаж работы ў іншых арганізацыях. Наталля Качанава даручыла больш уважліва разабрацца і вывучыць пытанне барысаўчанкі.

З пытаннем аб падтапленні зямельнага ўчастка звярнулася жыхарка мікрараёна Дымкі горада Барысава Галіна Уладзіміраўна. Яна расказала, што насупраць яе дома на дарозе кожны год утвараецца глыбокая яма і дом пастаянна затапляе. «Цяпер адбыўся абвал, тырчаць металічныя апалубкі. Пражываем у аварыйных умовах», — наракае жанчына.

Старшыня Барысаўскага райвыканкама растлумачыў, што на гэтай вуліцы ажыццяўляюць пастаяннае грэйдзіраванне дарогі. «Трэба зрабіць гэтую вуліцу. Вы самі гэта разумееце. Трэба вырашыць пытанне з падтапленнем раз і назаўжды. Трэба зрабіць якасна, а не выкідваць грошы на грэйдзіраванне», — падкрэсліла спікер Савета Рэспублікі.

* * *

Журналістам Наталля Качанава расказала: «Кожны раз паступаюць розныя пытанні, і я нават не рабіла б акцэнт на чымсьці канкрэтным. Калі раней мы рабілі акцэнт на жыллёва-камунальнай гаспадарцы, то цяпер такога няма. Як правіла, людзі звяртаюцца абсалютна па розных пытаннях. І вельмі шмат пытанняў асабістых, якія датычацца ўнутрысямейных праблем, тады, калі людзі дзеляць нейкую маёмасць пры разводзе, калі вырашаюцца пытанні іх дзяцей».

Падводзячы прамежкавыя вынікі прыёму грамадзян, спікер Савета Рэспублікі адзначыла тыя звароты, якія датычацца сістэмы адукацыі: «Мне здаецца, што цяпер мы больш уважліва павінны звяртаць увагу на выхаванне дзяцей у школах, у дзіцячых дашкольных установах. У дзіцяці павінна фарміравацца пачуццё справядлівасці, яно павінна адчуваць, што ёсць справядлівасць. Дзеці вельмі хваравіта ставяцца да несправядлівасці ў адносінах паміж дзецьмі, паміж педагогам і вучнем. Гэта тое, пра што заўсёды гаворыць Прэзідэнт нашай краіны, калі сустракаецца з педагогамі на педагагічных канферэнцыях, на нарадах. Школа павінна не толькі вучыць. Школа павінна выхоўваць. Гэта вельмі важна».

Падчас прыёму грамадзян было пачута шмат слоў падзякі ў адрас кіраўніка дзяржавы і вертыкалі ўлады. «Гэта сведчыць у цэлым аб рабоце ўлады ў нашай краіне. Мы гэтыя падзякі чуем, калі сустракаемся з людзьмі ў калектывах, арганізацыях, установах. Людзі дзякуюць за тую палітыку, якая праводзіцца ў нашай краіне. Ну а калі людзі прыходзяць на прыёмы, часта гучаць словы ўдзячнасці за стаўленне ў вырашэнні таго ці іншага пытання. Гэта сведчыць пра тое, як працуюць мясцовыя органы ўлады і наогул вертыкаль у цэлым у нашай краіне. У нас выбудавана сістэмная работа па зваротах грамадзян. Гэта значыць, чалавек сёння мае права звярнуцца або на асабісты прыём, або на прамую тэлефонную лінію. Прыёмы па асабістых пытаннях праводзяць рэспубліканскія органы кіравання, мясцовыя органы ўлады, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, дэпутаты ўсіх узроўняў, члены Савета Рэспублікі. Мне здаецца, няма нават такога дня, каб хтосьці не праводзіў прыём па асабістых пытаннях.

Усе праблемы, агучаныя падчас прыёму грамадзян, даручана ўзяць на кантроль і знайсці спосабы іх вырашэння.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота БелТА.**

*г. Барысаў.*

***У адзіны дзень прыёму члены Савета Рэспублікі працавалі ўчора ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці. З чым прыходзілі людзі на прыём да сенатараў, раскажам падрабязна ў дадатку «Мясцовае самакіраванне».***

---

ца ўсе дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, — канстатаваў ён. — Безумоўна, ключавой падзеяй будзе зварот Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь са штогадовым Пасланнем да парламента і беларускага народа, у якім кіраўнік дзяржавы расставіць акцэнты ва ўнутранай і знешняй палітыцы краіны. І задача парламента, як і ўсіх галін улады, — забяспечыць дакладную рэалізацыю курса, абазначанага лідарам нашай краіны».

Ён адзначыў, што асаблівую ўвагу кіраўнік дзяржавы ўдзяляе пытанням эканомікі, інвестыцыйнага патэнцыялу краіны, падтрымцы бізнесу, пытанням рэгулявання цэнавай палітыкі. Спікер падкрэсліў, што ў завяршальны год пяцігодкі трэба прыкласці ўсе намаганні для дасягнення ўстаноўленых параметраў. І задача дэпутацкага корпуса, па яго словах, — унесці ў гэта годны ўклад.

«Найперш гэта датычыцца заканадаўчай дзейнасці, — канкрэтызаваў Ігар Сергяенка. — Усе законапраекты эканамічнага блока павінны ствараць неабходныя ўмовы для стварэння зразумелых правіл паводзін удзельнікаў на аснове прынцыпу справядлівасці, зніжэння залішняй зарэгуляванасці, развіцця бізнесу, дэкрыміналізацыі эканамічных рызык. Іх трэба падрыхтоўваць у максімальна кароткія тэрміны з шырокім прыцягненнем зацікаўленых, каб забяспечыць дасканалую прапрацоўку наступстваў прыняцця прававых актаў».

## З РЭАЛЬНАЙ ПРАКТЫЧНАЙ КАРЫСЦЮ

У такім жа ключы дэпутатам даручана весці работу па вывучэнні правапримяняльнай практыкі. Пастаўлена задача — выходзіць на канкрэтныя прапановы па вырашэнні праблемных пытанняў.

Самую сур'ёзную ўвагу, па яго словах, неабходна аддаваць рабоце па маніторынгу цэн. «Гэтым дэпутаты падчас работы ў акругах займаюцца, — канстатаваў Ігар Сергяенка. — На нядаўняй нарадзе па цэнаўтварэнні кіраўніком дзяржавы пастаўлены жорсткія патрабаванні адносна справядлівага падыходу да фарміравання цэн на плодаагародніннную прадукцыю, лекі і адзенне — гэта тое, што найбольш хвалюе сёння нашых людзей. Таму яшчэ раз хацеў бы звярнуць увагу на пастаянны сістэмны ўдзел дэпутатаў у маніторынгу цэн у сваіх акругах».

У ходзе праведзенага 21 лютага ў Смалявіцкім раёне Мінскай вобласці семінара па сельгастэматыцы Прэзідэнт паставіў задачу пракантраляваць утрыманне жывёл на малочнатаварных комплексах, а таксама падрыхтоўку да вясенне-палявых работ. «Гэта задача пастаўлена непасрэдна памочнікам, упаўнаважаным Прэзідэнта па абласцях, — канкрэтызаваў спікер. — Але рэкамендавана ў гэтай рабоце задзейнічаць патэнцыял вядучых спецыялістаў НДІ Мінсельгасхарча, а таксама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, якія маюць досвед работы кіраўнікамі сельскагаспадарчых арганізацый і сельгасраёнаў. Такую практыку мы пачынаем ужо прымяняць».

## ГОЛАС МОЛАДЗІ І ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

Дэпутаты зацвердзілі Палажэнне аб Маладзёжным савеце пры Палаце прадстаўнікоў. Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Валерый МАЛАШКА,** гэта будзе грамадска-кансультатыўны орган. «Сама пабудова Маладзёжнага савета — па новых прынцыпах, — расказаў ён. — Малады чалавек будзе вылучацца з кожнай дэпутацкай акругі. Дэпутат, які працуе ў гэтай акрузе, выступіць настаўнікам.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК** расказаў аб далейшых планах на парламенцкія чытанні, якія па ініцыятыве дэпутатаў арганізаваны з нагоды 80-годдзя Вялікай Перамогі. Мерапрыемствы запланаваны ў Азарычах, на «Лініі Сталіна», на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

### Дарэчы

10 сакавіка 2025 года ў Палаце прадстаўнікоў адбудзецца асабісты прыём Старшыні Палаты прадстаўнікоў Ігара Сергяенкі.

Папярэдні запіс на асабісты прыём будзе ажыццяўляцца з 4 да 6 сакавіка з 8.00 да 17.00 (перапынак з 13.00 да 14.00).

Тэлефон для запісу: 8 (017) 222-69-25.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. Тел.: +375 17 310-36-37 |
| **Продавец** | РО «БЕЛАГРОСЕРВИС», г. Минск, ул. Козлова, д. 25а, УНП 190431542 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
Местонахождение: Минский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 29а

| Лот № | Наименование лота | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Агрегат посевной AMAZONE Cirrus 6001 Super**, 2007 г. в. | **46 099,20** |
| 2 | **Сеялка точного высева Kverneland Unicorn «id 7240»,** 2010 г. в. | **4 845,60** |
| 3 | **Погрузчик АМКОДОР 332С**, 2005 г. в. | **54 000,00** |
| 4 | **Трактор «Беларус-82.1»**, 2009 г. в. | **14 760,00** |
| 5 | **Комбайн зерноубор. КЗС-1218-10 «Палессе»,** 2010 г. в. | **88 800,00** |
| 6 | **Трактор Беларус-952**, 2006 г. в. | **13 800,00** |
| 7 | **Автомобиль МАЗ-5551 03-2125Р**, 2005 г. в. | **15 300,00** |
| 8 | **Прицеп-самосвал МАЗ 8571 020**, 2005 г. в. | **4 500,00** |
| 9 | **Трактор «Беларус-2022.3»**, 2007 г. в. | **26 640,00** |
| 10 | **Трактор «Беларус-82.1»**, 2007 г. в. | **17 280,00** |
| 11 | **Трактор «Беларус 1523»**, 2012 г. в. | **40 080,00** |
| 12 | **Трактор «Беларус 82.1»**, 2009 г. в. | **14 880,00** |
| 13 | **Почвообр. агрегат АПН-3** , 2011 г. в. | **8 640,00** |
| 14 | **Плуг полунавесной оборотный ППО-8-40К,** 2010 г. в. | **6 600,00** |
| 15 | **Трактор «Беларус МТЗ 82.1»**, 2009 г. в. | **15 480,00** |
| 16 | **Трактор «Беларус МТЗ 82.1»**, 2013 г. в. | **22 800,00** |
| 17 | **Автомобиль MAZ 551605 4275РБ,** 2013 г. в. | **40 560,00** |
| 18 | **Автомобиль MAZ 6501 A8-325-000**, 2013 г. в. | **50 760,00** |
| 19-25 | **Состав лота: пленка полиэтиленовая** (Сербия, 2017 г. в.), ширина 1,5 м, толщина 100 мкм., 36 рулонов по 200 м. п., цвет зелёный | **12 960,00** (за один лот) |

**Шаг торгов – 5 % от текущей цены**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты предмета аукциона: 10 (десять) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 04.04.2025 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **03.04.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги», по адресу: www.ipmtorgi.by

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by)**

**Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by

**ИНФОРМАЦИЯ**
**о проведении повторных аукционных торгов по продаже транспортных средств, находящихся в собственности дочернего унитарного предприятия «Проектный институт Брестгипрозем» республиканского унитарного предприятия «Белгипрозем»**

| **№ лота** | **1** | **2** |
|---|---|---|
| **Наименование объекта** | **Автомобиль легковой специальный внедорожник универсал UAZ 3163-239-21**, регистрационный номер 1619 IT-1, 2014 года выпуска, цвет – зеленый металлик | **Автомобиль легковой специальный внедорожник универсал UAZ 3163-239-21**, регистрационный номер 1618 IT-1, 2014 года выпуска, цвет – зеленый металлик |
| **Начальная цена продажи (с НДС)** | **6 183,27 (снижена на 30 %)** | **6 183,14 (снижена на 30 %)** |
| **Сумма задатка** | 600,00 | 600,00 |

**Размер штрафа** уплачиваемый в случаях, определённых Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609 — **4 200 рублей (BYN)**

**Продавец –** дочернее унитарное предприятие «Проектный институт Брестгипрозем» республиканского унитарного предприятия «Проектный институт Белгипрозем» г. Брест, ул. Малая, 3/1, тел.: 58-93-46; 8 (029) 720-87-98

Извещение о проведении аукционных торгов опубликовано на сайтах: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www gki.gov.by

**Аукцион состоится 01 апреля 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607**

**Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 28.02.2025 г. до 16.00 26.03.2025 г. по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50**

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», г. Брест, ул. Ленина, 50, тел. 53-81-92.**
www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by

Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет №BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924, в срок до 16.00 26.03.2025 г.

**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис»**
(УНП 700010487, г. Могилев, ул. А. Павлова, 7)

**Аукцион состоится 19.03.2025 в 12.00**
**по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**
(офис Организатора аукциона)

Лот № 1: **Изолированное помещение с инв. № 700/D-1599848 – Производственно-бытовой корпус**, назначение: помещение специализированное иного назначения, пл. 2598,00 кв. м, адрес: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а.

**22/100 доли капитального строения с инв. № 700/С-117992 – Промышленная площадка для стоянки автомобилей**, назначение: сооружение специализированное транспорта, пл. 17110,5 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/5.

**Капитальное строение с инв. № 700/С-118290 – Кирпичное ограждение**, назначение: сооружение благоустройства, протяженностью 115,7 м. Адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/9.

**Ковер напольный**, 2,5х2,5, инв. № 398. **Набор мебели**, инв. № 399. **Сплит-система TCL**, инв. № 2019. **Шкаф**, инв. № 119. **Котел твердотопливный КС-Т-80**, инв. № 656. **Котел твердотопливный КС-Т-80**, инв. № 657. **Холодильный шкаф**, инв. № 84. **Холодильный шкаф**, инв. № 83. **Гарнитур «Кабинет директора»**, инв. № 965. **Стенка встроенная,** инв. № 536**. Электросирена**, инв. № 3111. **Стул**, инв. № 540. **Стул**, инв. № 541. **Стул**, инв. № 542. **Стул**, инв. № 543. **Стул**, инв. № 544. **Стул**, инв. № 549.**Телефакс Panasonic kx-F130**, инв. № 477. **Телефакс Panasonic kx-F131**, инв. № 518. **Телефон Panasonic kx-FPHS**, инв. № 519. **Телефон LX-F130**, инв. № 986. **Весы МК-15.3 – А21**, инв. № 953. **Витрина ВХС-0,28 ТАИР – 1221 (1,5),** инв. № 644. **Мармит**, инв. № 272. **Телефакс**, инв. № 2600. **Терминал Indenico ICT220 GPRS/Ethernet/ Dial-up с выносной клавиатурой д/ввода пин IPP 220 Contractless**, инв. № 963. **Факс**, инв. № 502. **Электронная плитка КЗ-0,5**, инв. № 273. **Электронный котел КПЭ 60**, инв. № 274. **Электроплита ПЭСМ-2**, инв. № 86. **Кассовый аппарат Миника 1102МИк НТС**, инв. № 954. **Кассовый аппарат Миника НТС 11**, инв. № 500002. **Кресло тканевое** – 1 шт. **Стул кожанный** – 1 шт. **Обогреватель** – 1 шт. **Обогреватель** – 3 шт. **Обогреватель** – 1 шт. **Огнетушитель** – 2 шт. **ОП-4(з) Огнетушитель** – 3 шт. **ОП-8 (з) Огнетушитель** – 10 шт. **Огнетушитель** – 1 шт. **Огнетушитель** – 2 шт. **ОП-5** – 1 шт. **Радиоприемник** б/у – 1 шт. **Радиоприемник** – 1 шт. **План эвакуации на ПВХ 300мм*400мм** – 3 шт. **Флаг государственный 0,75*1,5мм** – 1 шт. **Чайник эл.** – 1 шт. **Чайник электрический Aresa K-1801** – 1 шт. **Электрочайник Scarlett SC-EK-21S59 Stell** – 1 шт. **Шкаф двухстворчатый** – 2 шт. **Жалюзи вертикальное** 10,66 кв. м – 2 шт. **Часы настенные Scarlett** – 1 шт. **Корзина для мусора** – 1 шт. **Удлинитель** – 1 шт. **Удлинитель с сетевым фильтром 6*5 м с заземлением 10А ССА 3*0.75 600 SH-5W** – 1 шт. **Сетевой фильтр Gembird SPG 3-B-6PP** – 1 шт. **Удлинитель** – 1шт. **Удлинитель** – 3 шт. **Сетевой фильтр** – 1 шт. **Телефон** – 1 шт. **Сотовый телефон** – 1 шт. **Телефонный аппарат Люкс 301-3** – 1 шт. **Телефон Bg 2831 Step XL*gray Philips xenium** – 1 шт. **Светильник Дельта** – 1 шт. **Светильник настольный** – 1 шт. **Светильник РВО-220 6м** – 1 шт. **Сетевой фильтр Gembird SPG 3-B-6PP** – 1 шт. **Вентилятор напольный** – 1 шт. **Полотно пожарное** – 1 шт. **Рукав пожарный,** 46 м. **Багор пожарный** – 1 шт. **Топор пожарный** – 1 шт. **Лом пожарный** – 1 шт. **Окно ПВХ VEKA:WHS ЭО (Белый/2180*1250/S:2,725)** – 1 шт. **Радиоузел 100У-101,** инв. № 215, – 1 шт.

**Начальная цена продажи: 729 244,45 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 72 924,45 бел. рублей.**

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код платежа – 40901. Срок подачи документов до 12.00 18.03.2025 г. Срок подписания договора купли-продажи – 10 календарных дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится на условиях договора купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок и сроки внесения задатков, оформления участия в аукционе, перечень подаваемых документов, порядок проведения аукциона, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8 (029) 624-26-25; Mogilev@ino.by**

**ИНФОРМАЦИЯ**
**О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ**
**по продаже права заключения договора аренды имущества, находящегося в республиканской собственности**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№№ 2025.Г.002.00055** по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** Транспортное республиканское унитарное предприятие «Минское отделение Белорусской железной дороги», г. Орша, ул. Константина Заслонова, 3, тел. 80216503733.

**Организатор, Оператор ЭТП ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru; **https://etpvit.by.**

**Дата и время проведения торгов: 31.03.2025 г. в 09.00**
**(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Лот № 1.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части нежилого помещения, расположенного в капитальном строении с инвентарным № 241/С-6486 (наименование – вокзал) – площадь пола 2,0 кв. м на 1-м этаже, по адресу: Витебская обл., Дубровенский район, Пироговский с/с, д. Осиновка, ул. Вокзальная, 10.

Целевое использование: размещение снекового вендингового автомата (напитки, продукты питания). Размер коэффициента спроса на недвижимое имущество, его техническое состояние и коммерческую выгоду от сдачи в аренду – 3,0.

**Нач. цена: 31,08 руб.**

Извещение о проведении торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/ (№ 29381) на сайте Витебского облисполкома https://vitebsk-region.gov.by/ru/Aukciony-ru/.

**Плещеницкий сельский исполнительный комитет**
*в рамках работы Указа Президента Республики Беларусь № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»*

**РАЗЫСКИВАЕТ СОБСТВЕННИКОВ, НАСЛЕДНИКОВ И ЛИЦ, ИМЕЮЩИХ ПРАВО ПОЛЬЗОВАНИЯ КВАРТИРОЙ, расположенной по адресу:**
**г. п. Плещеницы, ул. Космонавтов, д. 20, кв. 12**
**Логойского района, Минской области**
(правообладатель – Давидович Татьяна Владимировна).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования квартирой, сообщить в Плещеницкий сельисполком, по адресу: 223130, Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. В. И. Ленина, д. 7, либо по телефонам: 8 (01774) 22-3-35, 22-1-65.

УНП 600181684

# НАМ ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА

## Мінэканомікі: імпартазамяшчэнне дазваляе захоўваць і развіваць кампетэнцыі ў сферы прамысловай вытворчасці




Пра гэта распавёў начальнік Галоўнага ўпраўлення эканомікі прамысловасці Міністэрства эканомікі Уладзімір Лабанаў у эфіры тэлеканала АНТ.

Як адзначыў прадстаўнік Мінэканомікі, Беларусь здолела прымножыць прамысловы патэнцыял, які дастаўся ў спадчыну ад Савецкага Саюза. Толькі за апошнія 10 гадоў аб'ём імпартазамяшчальнай прадукцыі вырас у 1,8 раза, перавысіўшы 29 мільярдаў долараў, а яе доля ў агульным аб'ёме вытворчасці дасягнула 47 %. Пры гэтым больш за палову яе экспартуецца.

— Захоўваючы курс на разумнае імпартазамяшчэнне, мы замяшчаем імпарт і павышаем канкурэнтаздольнасць сваіх тавараў, — цытуе Уладзіміра Лабанава прэс-служба эканамічнага ведамства.

Паводле яго слоў, сёння ў прапрацоўцы — звыш 3 тысяч пазіцый для імпартазамяшчэння. У засваенні гэтай прадукцыі ўдзельнічаюць звыш 2700 арганізацый, траціна з іх — гэта суб'екты малога і сярэдняга бізнесу.

— У рамках кааперацыі рэальнага сектара і навукі ствараем айчынныя кампаненты і кампазітныя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца ў вытворчасці легкавых аўтамабіляў, станкоў і іншых сферах, — адзначыў прадстаўнік Мінэканомікі.

У якасці прыкладаў ён прывёў энергаэфектыўныя трактары і камбайны, 130-тонны гібрыдны самазвал БелАЗ, 4-тонны грузавік МАЗ на электрацязе.

— Гэта сучасная, запатрабаваная на знешніх рынках тэхніка, створаная рукамі беларусаў. Праца ідзе актыўна і вынікова — нам ёсць чым ганарыцца, — сказаў на заканчэнне спікер.

# КРОК ДА ПОСПЕХУ

## Кожны рамеснік у перспектыве можа стаць уласнікам пасняховай кампаніі

У гэтым пераканана намеснік дырэктара Дэпартамента па прадпрымальніцтве Ірына Бабачонак, агучыўшы гэты тэзіс падчас VII канферэнцыі «Самазанятасць» праекта «Рэсурсы і магчымасці», якая прайшла ў Смаргоні Гродзенскай вобласці.

Прадстаўнік Мінэканомікі зрабіла акцэнт на магчымасцях, якія адкрываюць навацыі Закона № 365 для самарэалізацыі ў бізнесе ў статусе фізічнай асобы, адзначае прэс-служба эканамічнага ведамства.

— З 1 кастрычніка 2024-га фізасобы — плацельшчыкі падатку на прафдаход — паўнапраўныя члены «прадпрымальніцкай сям'і». Але пры гэтым самазанятым аб'ектыўна лягчэй рабіць першыя крокі ў бізнесе: мінімальныя марнаванні часу на справаздачнасць, спрошчаны фіскальны рэжым плюс доступ да паслуг суб'ектаў падтрымкі прадпрымальніцтва, — нагадала спікер.

На яе думку, самазанятасць — добрая магчымасць даведацца на практыцы, наколькі ў табе развіта «дзелавая жылка», зарабіць неабходны вопыт і бізнес-багаж і ў далейшым перайсці на наступную прыступку — стварыць камерцыйную арганізацыю:



— Кожны рамеснік у перспектыве можа стаць уласнікам пасняховай кампаніі.

Ірына Бабачонак таксама распавяла ўдзельнікам мерапрыемства аб дзеючых інструментах фінансавай і нефінансавай падтрымкі пачынаючых прадпрымальнікаў.

# УЗАЕМНАЯ ЦІКАВАСЦЬ

## Новыя імпульсы для беларуска-пакістанскіх гандлёва-эканамічных адносін абмеркавалі ў Мінску



Перспектывы гандлёва-эканамічных адносін Беларусі і Пакістана, крокі да пераадолення праблем і «падводных камянёў», якія знаходзяцца на шляху дзелавога супрацоўніцтва абедзвюх краін, абмеркавалі **старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Міхаіл МЯТЛІКАЎ** і **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Рэспубліцы Беларусь Мухамед АЙДЖАЗ**, паведамілі ў прэс-службе БелГПП.

Адзначым, што на працягу апошніх трох гадоў паміж Беларуссю і Пакістанам назіраецца паслядоўны рост аб'ёму тавараабароту. Сёння Беларусь пастаўляе ў Пакістан трактары і запасныя часткі да іх, грузавыя аўтамабілі, калійныя ўгнаенні, жгуты сінтэтычных нітак і сінтэтычныя валокны, шыны, станкі, дзіцячае харчаванне (сухія сумесі), малочныя прадукты.

У сваю чаргу, Пакістан пасняхова экспартуе ў Беларусь рыс, агародніну, садавіну, вырабы і матэрыялы са скуры, тканіны, тэкстыль.

Паводле слоў Міхаіла Мятлікава, патэнцыял узаемадзеяння нашых краін дазваляе забяспечыць больш высокія паказчыкі. Мерапрыемствы, якія праводзяцца сумеснымі намаганнямі, дапамагаюць наладзіць цеснае супрацоўніцтва, дэталёва пазнаёміць бізнесы адзін з адным, намеціць сферы для далейшага развіцця ўзаемавыгадных адносін.

Адным з такіх мерапрыемстваў стаў пакістана-беларускі бізнес-форум, які прайшоў у Ісламабадзе ў лістападзе мінулага года з удзелам кіраўнікоў і прадстаўнікоў розных міністэрстваў, бізнесу абедзвюх краін. У рабоце форуму ўзялі ўдзел больш за 250 кампаній з розных сфер дзейнасці. Падпісана восем дакументаў на агульную суму больш за 17 мільёнаў долараў. Адбылася вялікая колькасць дзелавых кантактаў, перагавораў аб магчымых кірунках супрацоўніцтва. Некаторыя папярэднія дамоўленасці фармалізаваны ў выглядзе меморандумаў аб узаемадзеянні.

Сёлета таксама плануецца маштабнае мерапрыемства: 10—11 красавіка 2025 года адбудзецца візіт Прэм'ер-міністра Пакістана ў Беларусь. У рамках гэтага візіту будзе арганізавана шостае пасяджэнне беларуска-пакістанскага дзелавога савета.

— Упэўнены, што гэты візіт надасць істотны імпульс развіццю двухбаковага гандлю. Калі будуць узгоднены дакументы аб супрацоўніцтве або кантракты паміж беларускімі і пакістанскімі кампаніямі, то пляцоўка Дзелавога савета стане выдатнай магчымасцю для падпісання гэтых дакументаў, — падкрэсліў Міхаіл Мятлікаў.

Пасол Пакістана ў Беларусі Мухамед Айджаз адзначыў, што ў нашых краін устаноўлены добрыя адносіны на ўсіх узроўнях, пачынаючы з самага высокага і заканчваючы бізнес-коламі. Дзякуючы правядзенню сумесных мерапрыемстваў у Пакістане пра Беларусь добра ведаюць як пра надзейнага партнёра і вытворцу якаснай прадукцыі. Ён таксама папрасіў БелГПП намеціць два-тры найбольш спрыяльныя сектары для супрацоўніцтва, на якіх можна было б сканцэнтраваць намаганні.

— Прафесіяналізм з'яўляецца сімвалам Гандлёва-прамысловай палаты Беларусі. Я ўпэўнены, што гэта прыцягне ў краіну велізарную колькасць бізнесу і зацікаўленых кампаній з Пакістана, — рэзюмаваў Мухамед Айджаз.

# ДОБРЫЯ ДАРОГІ СОЛІ НЕ БАЯЦЦА

## КАЛІ ІХ СВОЕЧАСОВА РАМАНТУЮЦЬ

Зараз белыя дарогі ў гарадах — ад салявога пылу, які трэба змываць. Намеснік генеральнага дырэктара па ўтрыманні аб'ектаў добраўпарадкавання ДВА «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Арцём ГАНЧАР падрабязна растлумачыў, калі пачнуць прыбіраць белы налёт з вуліц Мінска:



— Белыя дарогі ў нас — штогод пры завяршэнні зімовага перыяду. У мэтах недапушчэння галалёдзіцы і барацьбы са снегам пры яго наяўнасці выкарыстоўваюцца процігалалёдныя матэрыялы, такія як тэхнічная соль і пясчана-салявая сумесь. Пры ўзаемадзеянні з ападкамі працэс плаўлення адбываецца хутчэй. У сёлетні зімовы перыяд з-за доўгай адсутнасці снежных ападкаў і мокрага снегу гэты працэс трошкі запаволіўся. Цяпер, калі будзе станоўчая тэмпература, мы пачнём работы па мыцці вулічна-дарожнай сеткі».

### Хімічныя эксперыменты

У Мінску з году ў год выкарыстоўваецца стандартная тэхнічная соль — мінеральны галіт маркі А, які здабывае «Беларуськалій», і сумесі на яго аснове. Цяпер дарожнікі не мыюць дарогі па прычыне перападаў тэмператур, паколькі гэта можа прывесці да галалёдзіцы. «Патроху лакальна і вельмі педантычна мы пачынаем выконваць работы, звязаныя з мыццём праезных частак і тратуараў. Масава выконваць гэта мы цяпер не можам, бо ў начны час прагназуюцца нулявыя альбо адмоўныя тэмпературы», — дадаў намеснік гендырэктара.

Акрамя хларыду натрыю, які цяпер ужываецца ў процігалалёдных сумесях у Беларусі, ёсць яшчэ хларыд кальцыю. «Але хларыду кальцыю ў нас у Беларусі няма. Гіпатэтычна мы можам прывезці яго з Расійскай Федэрацыі. Яго кошт будзе ў 80 разоў большы, а расход можа быць у два разы меншы. Але ёсць нюансы.

«Праз тое, што матэрыял дарагі, натуральна, патрэбнае вельмі дакладнае дазіраванне, — лічыць **начальнік упраўлення вытворчасці работ і ўтрымання дарожнай сеткі РУП «Мінскаўтадар-цэнтр» Дзмітрый ДЗЕМІДОВІЧ.** — У Маскве ў свой час перайшлі на хларыд кальцыю, але атрымаўся адваротны эфект. У яго ёсць вельмі дзіўная ўласцівасць. Ён працуе пры вузкім дыяпазоне тэмпературы. Вось калі мінус 1,5 градуса — усё добра, а стала мінус 2 градусы — і ўсё гэта зноў замярзае. Становіцца яшчэ горш. Людзі скардзіліся, што пасля яго выкарыстання ёсць «эфект прыклейвання», калі падэшва абутку прыляпляецца да дарогі».

У скандынаўскіх краінах тратуары апрацоўваюць гранітнай крошкай. «Груба кажучы, яны практычна на скалах стаяць — у іх гэтага матэрыялу вышэй даху. Для іх соль — рэдкасць, — адзначыў начальнік упраўлення. — Але, выкарыстоўваючы гадоў пяць гэты матэрыял, яны пазабівалі сабе ўсю ліўневую каналізацыю. Ён там прэсуецца, гэта практычна бетон, і яго немагчыма потым адтуль дастаць».

У Беларусі ж ёсць уласны і танны рэсурс — соль, які ў асноўным і выкарыстоўваецца ва ўсім свеце.

**«Хтосьці пачынае разважаць, што яна, маўляў, шкодная. Ды гэта тая ж соль, якой мы дома карыстаемся, — падкрэсліў Дзмітрый Дземідовіч. — Таму нічога новага не будзе, паверце вы мне. Калі нешта знойдуць танней у нас у краіне, тады гэта будзе і ў дарожнікаў. А нашу соль купляе і Еўропа, і Расія. І гэтак жа, як і мы, з ёй працуюць».**

### Сталічны рэгіён практычна вырашыў праблему ямачнасці

Гэтаму спрыялі павелічэнне фінансавання на бягучы рамонт і мяккая зіма, — адзначыў Дзмітрый Дземідовіч. У першую чаргу пасля зімы неабходна прыбраць смецце, ачысціць маставыя збудаванні і прыпынкі. Пры неабходнасці пафарбаваць іх, а таксама ачысціць стойкі дарожных знакаў і агароджаў — як дарожных, так і пешаходных. Неабходна прыбраць снегазатрымлівальныя шчыты і сеткі, сабраць і адсартаваць сігнальныя вехі.

**Міністэрствам транспарту і камунікацый Беларусі распрацаваны план на 2025—2027 гады.**

**За гэты час усе апоры дарожных знакаў і ўсе агароджы на дарогах будуць заменены на ацынкаваныя. Гэта дазволіць адмовіцца ад штогадовай афарбоўкі.**

А яшчэ ў Мінскай вобласці сталі інтэнсіўна пераходзіць на выкарыстанне святлодыёдных свяцільняў на дарогах. «Гэта эканоміць сродкі на электраэнергію. Звычайныя лямпы выгараюць на працягу 2-3 месяцаў. Тэрмін службы святлодыёдных свяцільняў — мінімум сем гадоў», — растлумачыў Дзмітрый Дземідовіч.

Вялікая ўвага аддаецца і азеляненню ўчасткаў дарог. Сёлета плануецца азеляненне 11 участкаў уздоўж дарог агульнай плошчай 7,7 тысячы квадратных метраў. «На рэспубліканскіх дарогах дрэвы не вельмі добра прыжываюцца, таму перавага аддаецца кустам. Летась іх было высаджана каля 36 тысяч штук, большая частка з іх — падчас суботнікаў. У гэтым годзе мы плануем высадзіць звыш 10 тысяч», — адзначыў эксперт.

**Дзмітрый Дземідовіч адзначыў, што фінансаванне на бягучы рамонт дарог значна павялічылася. «Як вынік, зменшылася колькасць ям. Сёлета астатак ямачнасці на сетцы дарог Мінскай вобласці складае 37 квадратных метраў. Летась гэта лічба была амаль 2 тысячы квадратных метраў, гэта значыць, у дзясяткі разоў больш», — звярнуў увагу начальнік упраўлення.**

У мінулым годзе ў Мінскай вобласці за кошт выдзеленых сродкаў пры планавым заданні 290 кіламетраў было адрамантавана амаль 324 кіламетры дарог. Планавае заданне на гэты год —260 кіламетраў, але дарожнікі пастараюцца адрамантаваць больш.

**Сяргей КУРКАЧ.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «МОГОТЕКС», г. Могилев, ул. Гришина, 87. УНП 700116054 |
| **Оператор / Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронного аукциона**

**Магазин (911,4 кв. м,** инвен. № 700/С-62152, составные части: подвал), по адресу: **Могилевская обл., г. Могилев, ул. 30 лет Победы, 28А**

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0934 га** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания магазина

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 677 880.00 бел. руб.** (снижена на 30 %)
Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) календарных дней** со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение 1,5 % от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение по лоту № 1 опубликовано в газете «Звязда» от 06.02.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 17.03.2025 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.03.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги», по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, принадлежащего РУП «Белпочта»**

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, руб. | Срок договора аренда |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1:** помещение, площадью 9,9 кв. м, расположенное в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-57288 (наименование: отделение почтовой связи; назначение: здание специализированное связи), по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Адамковская, д. 58А | 43,96 | не менее 3 лет |

**Организатор аукциона: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», 224005, г. Брест, ул. Наганова, 10-329; тел. 80162 40 87 01**

**Аукцион состоится 27 марта 2025 г. в 11.00, по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/29413)

УНП 201028245



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Могилевские семена трав» (Продавец) на праве собственности**

Электронные торги состоятся **20.03.2025 г. в 11.00** на электронной торговой площадке GOSTORG.BY

**Лот № 1: Автомобиль Audi A8,**
**г. в. 1996, р/з 1036 АЕ-6, инв. № по бух. учету 336, VIN № WAUZZZ4DZTN002902.**

**Начальная цена продажи: 10 620.00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 1 062,00 бел. руб.**

Местоположение Лота № 1: г. Могилев, Шкловское шоссе, 27.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, Могилевского облисполкома и на торговой площадке GOSTORG.BY.
Организатор торгов и оператор ЭТП:
**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352; Mogilev@ino.by.
Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +375 (29) 624-26-25;** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона**: ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1

**Продавец:** ОАО «АГАТ-стройсервис», 231103, Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Советская, 173

| № лота | Инв. номер | Предмет аукциона | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. (снижена на 95 %) | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Оборудование (б/у), расположенное по адресу: Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Советская, 173** | | | | |
| 1 | | Имущество, реализуемое одним лотом: холодильник «Атлант Х-1401-100», XEROX 3100 MFPV S (инв. номер 000000091), персональный компьютер «Сильверадо» (инв. номер 000000076) | 16,62 | 0,83 |
| 2 | 000000043 | Пилорама Р-634Б | 2046,00 | 102,30 |
| 3 | 000000052 | Долбежный станок | 39,60 | 1,98 |

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **18.03.2025** в 12.00 по адресу: **220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **17.03.2025** до 17.00 по адресу: **220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Совринович Алексей Генрихович, тел. +37544-767-78-80

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».
К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке.
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.ipmtorgi.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (10 % от цены продажи) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.02.2025 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел. +375 44 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



ОАО «Гомельжилпроект»
извещает о приобретении на баланс общества акций собственного выпуска:
предложение о покупке акций ОАО «Гомельжилпроект»

| | |
|---|---|
| Полное наименование и место нахождения покупателя | Открытое акционерное общество «Гомельжилпроект», 246050, г. Гомель, ул. Кирова, 17 |
| Полное наименование, место нахождения открытого акционерного общества, акции которого приобретаются | Открытое акционерное общество «Гомельжилпроект», 246050, г. Гомель, ул. Кирова, 17 |
| Цель приобретения акций | Продажа инвестору на условиях, предусмотренных бизнес-планом акционерного общества |
| Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель | 10 000 (десять тысяч) штук |
| Фиксированная цена покупки акций | 10,10 бел. руб. (десять белорусских рублей десять копеек) |
| Порядок и форма расчетов | Оплата акций будет произведена в денежной форме не позднее 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи на банковские счета акционеров, указанные в заявлении |
| Адрес, по которому будут приниматься предложения и заключаться договоры купли-продажи акций | 246050, г. Гомель, ул. Кирова, 17 |
| Дата начала и окончания срока представления акционерами предложений о продаже акций | С 10.03.2025 г. по 25.03.2025 г. |
| Дата начала и окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи акций) | С 26.03.2025 г. по 30.04.2025 г. |

Контактный телефон: +375 232 34 03 04.

УНП 400022625


Іван КУБРАКОЎ:

# «СЁННЯ САМЫ НІЗКІ ЎЗРОВЕНЬ ЗЛАЧЫННАСЦІ»

## Падрабязнасці прэс-канферэнцыі міністра ўнутраных спраў



Фота БелТА.

Такі фармат узаемаадносін з прадстаўнікамі СМІ з нагоды Дня міліцыі — ужо традыцыя. Сёлета не стала выключэннем. Кіраўнік ведамства праінфармаваў аб зніжэнні ўзроўню злачыннасці, стварэнні спецпадраздзяленняў, прафілактычнай рабоце з беспрацоўнымі, акцэнтаваў увагу на выхаванні патрыётаў. Прыводзім асноўныя тэмы размовы Івана Кубракова з журналістамі.

**Спецпадраздзяленні.** «Ва ўнутраных войсках ва ўсіх рэгіёнах з'явіліся спецыяльныя падраздзяленні. Гэта невялікія атрады, якія выконваюць спецыяльныя задачы. Пачатак стварэння такіх падраздзяленняў быў пакладзены пасля 2020 года. Сітуацыя была напружаная, таму прынялі рашэнне стварыць такія атрады, якія гатовы выканаць пастаўленую задачу ў любым месцы ў любы час. І, як паказаў час, гэтыя падраздзяленні патрэбны. Асабліва з улікам сітуацыі, якая адбываецца ў прыгранiччы з Украінай. Там пастаянна працуюць нашы падраздзяленні ўнутраных войск. Не хачу сказаць, што сітуацыя там напружаная, але з улікам таго, што ў суседняй краіне ідзе вайна, мы павінны быць гатовы забяспечыць бяспеку нашых грамадзян, дзе б яны ні знаходзіліся».

**Булінг.** «Мы даём ацэнку тым дзеянням, якія адбываюцца ў тым ліку ў інтэрнэце, калі абражаюць, зневажаюць. Мы ніколі не пакідаем гэта без увагі. Перад электаральнай кампаніяй узрасло напружанне, калі ліліся абразы ў адрас участковых камісій, службовых асоб. Ні адна такая абраза не прайшла міма нашага падраздзялення па інтэрнэт-разведцы. Мы ўсё фіксавалі, усе матэрыялы накіроўваліся для дачы прававой ацэнкі ў Следчы камітэт. Сёння механізмаў дастаткова, каб даць прынцыповую ацэнку такім дзеянням, як булінг».

**Злачынствы.** «Другасных злачынстваў няма. Мы цудоўна разумеем, якія негатыўныя наступствы могуць быць ад любога злачынства. Адно пытанне — маштаб: гэта фізічная асоба, сям'я або грамадства. Мы вельмі старанна працуем па ўсіх відах злачынстваў, якія здзяйсняюцца. Вядома, у першую чаргу засяроджана ўвага на тых злачынствах, якія здзяйсняюцца ў адносінах асобы: гэта і забойствы, і цяжкія цялесныя пашкоджанні. Асаблівая ўвага ўдзяляецца экстрэмізму, тэрарызму, бо маштабы гэтых злачынстваў вельмі вялікія. І не толькі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Што датычыцца нарказлачынстваў, працуюць не толькі супрацоўнікі міліцыі — задзейнічаны ўсе суб'екты прафілактыкі. Пад асаблівым кантролем знаходзіцца ўцягванне ў злачынную дзейнасць непаўналетніх. Любому злачынству, якое здзяйсняецца, мы даём прынцыповую ацэнку».

**Работа з беспрацоўнымі.** «Што датычыцца асоб, якія працаздольныя і не занятыя ў эканоміцы, да іх кантроль асаблівы. Аб гэтым неаднаразова казаў наш Прэзідэнт. Усе цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы, якія здзяйсняюцца ў побыце, асабліва ў адносінах асобы, на 90 % і нават больш здзейснены асобамі, якія не заняты ў эканоміцы. Таму гэта катэгорыя знаходзіцца ў нас на асаблівым кантролі. І, вядома, мы арганізоўваем пэўную работу. Яна праводзіцца сумесна з органамі працы, падраздзяленнямі падатковай інспекцыі. Ёсць людзі, якія не заняты ў эканоміцы, плюс да ўсяго яны яшчэ злоўжываюць спіртнымі напоямі і здзяйсняюць правапарушэнні. Таму мы павінны ведаць гэтых людзей і, вядома, з імі працаваць. Сёння ў падраздзяленні працы і сацабароны выстройваюцца чэргі. Гэта сведчыць аб тым, што наша прафілактычная работа дае вынік».

**Замежныя грамадзяне.** «На вуліцах Мінска і не толькі з'явілася больш замежнікаў. Гэта і вынік бязвізавага рэжыму: у нашу краіну едуць, нашу краіну любяць. Усе даводзяць інфармацыю, што ў нашай краіне бяспечна, і ўсё больш людзей да нас прыязджае. Крымінагенная сітуацыя з замежнымі грамадзянамі знаходзіцца поўнасцю пад кантролем. Мы не бачым усплёску злачыннасці, правапарушэнняў сярод замежных грамадзян. Пачынаючы з аэрапорта, працуем з гэтай катэгорыяй, тлумачым асаблівасці нашага заканадаўства. Адно найменшае правапарушэнне — прымаюцца самыя жорсткія меры: ажно да высылкі з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь».

**Кадры.** «Прыкладна з дзевяцігадовага ўзросту дзеці наведваюць нашы патрыятычныя клубы. Яны створаны па ўсёй краіне, нават у маленькіх раённых цэнтрах. Летась 90 % выпускнікоў нашых патрыятычных клубаў паступілі ў ВНУ сілавога блока краіны. Але самае галоўнае не тое, кім яны хочуць стаць. Самае галоўнае, што мы іх выхоўваем у патрыятычным духу, яны гатовы абараняць нашу краіну, яны сапраўдныя патрыёты. Створаны два спецыялізаваныя ліцэі МУС — у Мінску і Магілёве (былі створаны па даручэнні кіраўніка дзяржавы). Гэта паспяховы праект, дзе вельмі вялікі конкурс. Наступная ступень — Магілёўскі інстытут МУС і Акадэмія МУС. Маючы сярэднюю адукацыю, прайшоўшы спецыяльную падрыхтоўку ў нашым навучальным цэнтры, таксама можна ўладкавацца ў органы ўнутраных спраў. Але ёсць шэраг патрабаванняў. За 2024-ы з заявай для службы ў органах унутраных спраў звярнуліся 6,5 тысячы чалавек. На службу прынялі ўсяго 2 тысячы. Адбор даволі жорсткі».

**Узровень злачыннасці.** «Практычна па ўсіх відах злачынстваў, асабліва па цяжкіх, у адносінах асобы, злачыннасць зніжаецца. За 2024 год мы дасягнулі піка зніжэння злачыннасці, сёння самы нізкі ўзровень злачыннасці за апошнія 30 гадоў. Напрыклад, у 1994 годзе былі зарэгістраваны 672 гвалты з замахам, у 2024 — 26. Што датычыцца разбояў, у 1994-м іх было зарэгістравана 1359, летась — 52. Пры гэтым раскрывальнасць была нават ніжэйшая за 50 %. Сёння 100 % усіх забойстваў, цяжкіх цялесных пашкоджанняў, гвалтаў раскрыта, усе злачынцы ўстаноўлены. Гэта вынік заканамернай працы як супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, суб'ектаў прафілактыкі, так і грамадзян. Вядома, на гэта ўплывае і своечасовае змяненне заканадаўства».

**Кіберзлачыннасць.** «Практычна ўсе злачынствы сыходзяць у інтэрнэт. Рост кіберзлачыннасці пачаўся з 2018 года. Менавіта ў Беларусі мы сталі рабіць першыя крокі па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці. Сёння ўпершыню за гэты час за два месяцы мы рэгіструем на 10 % зніжэнне кіберзлачынстваў. Усе махлярствы, якія здзяйсняюцца ў адносінах асоб, адбываюцца, як правіла, з-за бяспечнасці нашых грамадзян. Але мы бачым, што вынік у прафілактычнай работы ёсць. Акрамя таго, ствараем новую аўтаматызаваную сістэму, якая дазваляе нам, органам унутраных спраў, заблакіраваць вывад грошай за межы нашай краіны. Мы шчыльна працуем з банкамі. Тыя меры, якія прымаем, у тым ліку аператыўныя, прыносяць свой плён — марудна, але ідзе зніжэнне кіберзлачынстваў у нашай краіне».

**Вераніка КАНЮТА.**

З НАГОДЫ

# ГІСТОРЫЯ МІЛІЦЭЙСКАЙ ДЫНАСТЫІ ДАЎЖЫНЁЙ У ТРЫ ПАКАЛЕННІ

## Службовая рамантыка, працяг сямейных традыцый і ахова правапарадку

Афіцэрская дынастыя Руткевічаў налічвае тры пакаленні, на падыходзе — і чацвёртае. Напярэдадні прафесійнага свята карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з бацькам Уладзімірам і сынам Сяргеем Руткевічамі. Яны падрабязна расказалі пра сваю службу, няпросты шлях да вялікіх пагонаў, а таксама пра тое, што паўплывала на іх прафесійны выбар.

### СВАЯКІ ЗАЎСЁДЫ БЫЛІ ДОБРЫМ ПРЫКЛАДАМ

На выбар будучай прафесіі **начальніка аддзялення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі Маладзечанскага РАУС падпалкоўніка міліцыі Сяргея РУТКЕВІЧА** паўплывалі яго сваякі. Дзядуля афіцэр, якога таксама звалі Сяргей, прыступіў да службы ўчастковым адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны. «Я добра памятаю, як у дзяцінстве ён часта расказваў мне самыя розныя гісторыі пра службу ў органах унутраных спраў, — кажа Сяргей Руткевіч. — Мой бацька таксама прысвяціў усё сваё жыццё ахове правапарадку. Яны сталі для мяне сапраўдным прыкладам. І таму калі ў 2000 годзе ў мяне паўстала пытанне аб тым, куды ўсё ж такі пайсці далей, кім я хачу быць, практычна адразу знайшоўся адказ. Прайшоўшы ўсе медыцынскія камісіі, я атрымаў накіраванне ад Маладзечанскага РАУС для паступлення ў Акадэмію МУС на следча-экспертны факультэт. Аднак у той год названы факультэт чамусьці скараціў свой набор, таму я і яшчэ некалькі чалавек апынуліся па-за бортам. Тады нам прапанавалі памяняць выбар і паступіць на крымінальна-выканаўчы факультэт Акадэміі. Мой бацька ацаніў і гэта, паколькі сам тады ўзначальваў крымінальна-выканаўчую інспекцыю Маладзечанскага РАУС».

Пасля заканчэння Акадэміі МУС Сяргей Руткевіч трапіў на службу ў Чэрвеньскі раён. Там і пазнаёміўся з будучай жонкай Ірынай. «Так атрымалася, што Ірына таксама па размеркаванні пасля заканчэння Барысаўскага медыцынскага вучылішча трапіла працаваць у Чэрвеньскі раён, — расказвае афіцэр. — Больш таго, мая папраўчая калонія і яе медустанова знаходзіліся на адной вуліцы. Мы, маладыя спецыялісты, жылі нават у адным інтэрнаце. Там пазнаёміліся, цяпер выхоўваем дваіх сыноў. Старэйшаму Ягору ўжо 17 гадоў. Ён скончыў школу з залатым медалём і таксама, можна сказаць, пайшоў па шляху сваёй сям'і: паступіў на юрыдычны факультэт БДУ па мэтавым накіраванні ад нашага следчага камітэта. Малодшаму сыну пакуль 12 гадоў. У яго яшчэ ўсё наперадзе».

Праз год службы на Чэрвеньшчыне Сяргей Руткевіч перавёўся ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу № 38, што знаходзілася на тэрыторыі Маладзечанскага раёна. Пачынаў звычайным оперупаўнаважаным і даслужыўся да намесніка начальніка ўстановы. Затым перавёўся ў Маладзечанскае РАУС у аддзяленне па наркакантролі. У 2018 годзе Сяргею Уладзіміравічу прапанавалі ўзначаліць ізалятар часовага ўтрымання, дзе ён і прапрацаваў больш за год.

«Затым начальнік аддзялення па наркакантролі Маладзечанскага РАУС пайшоў на павышэнне, тады мне прапанавалі заняць яго месца, — удакладняе падпалкоўнік міліцыі. — З 2019 года я ўзначальваю гэтае невялікае, але вельмі важнае падраздзяленне. Сёлета будзе роўна 25 гадоў, як я працую ў органах унутраных спраў. Наша работа вельмі цікавая. Яшчэ калі вучыўся ў Акадэміі МУС, бачыў сябе менавіта ў аператыўнай рабоце. Мне заўжды хацелася больш руху, такой міліцэйскай рамантыкі, займацца расследаваннямі, стаяць на варце жыцця людзей».

Па словах афіцэра, у наркакантролі ёсць свая спецыфіка. «Мы займаемся не толькі наркотыкамі, але і палавымі злачынствамі, здзейсненымі супраць непаўналетніх, — удакладняе ён. — Сітуацыя па наркотыках застаецца пад кантролем. Няма рэзкіх скокаў уверх або велізарнага зніжэння ўніз».

### СЛУЖБА Ў МІЛІЦЫІ — МАРА ДЗЯЦІНСТВА

Бацька галоўнага героя — маёр міліцыі ў адстаўцы Уладзімір Руткевіч — з дзяцінства марыў стаць міліцыянерам. Яго бацька Сяргей таксама стаў для яго сапраўдным прыкладам. «Спачатку мне давялося адслужыць тэрміновую службу, таму што да арміі нельга было ні паступаць, ні працаваць, — узгадвае ён. — Пасля арміі паступіў на службу радавым міліцыянерам, а затым — у сярэднюю школу міліцыі імя Фрунзэ. Скончыў працоўную дзейнасць на пасадзе начальніка крымінальна-выканаўчай інспекцыі. Затым яшчэ 10 гадоў прапрацаваў у ДАІ. Так што агульны стаж у МУС — каля 40 гадоў. Я не настойваў, каб мой сын пайшоў па маіх слядах. Гэта было цалкам яго рашэнне, якое я з задавальненнем падтрымаў».

Калегі Сяргея, якія ведаюць яго бацьку Уладзіміра, часта пытаюцца, ці не адправіў ён сына ў Акадэмію МУС мэтанакіравана. «Вядома, яго аповеды пра службу моцна паўплывалі на мяне. Аднак канчатковае рашэнне заставалася за мной. Ён падтрымаў мяне ў гэтым, — расказвае Сяргей Руткевіч. — Затым я стаў пацiху рухацца па кар'ернай лесвіцы, стаў набліжацца да званняў дзеда і бацькі, а потым ужо і перасягнуў іх. Можа быць, мой сын і мяне пераскочыць калісьці».



Дзядулю галоўнага героя Сяргею Руткевічу давялося служыць у складаныя часы. Пасляваенная разруха, росквіт злачынных фарміраванняў і банд — праз усё гэта прайшоў малады ўчастковы. Пасля заканчэння ваеннай службы ён трапіў у міліцыю. «Я часта пытаўся ў яго, як ён апынуўся ў міліцыі, — успамінае Сяргей Руткевіч, — Тады ўсіх, хто адслужыў у арміі, запрашалі на розныя пасады. Дзядулю прапанавалі стаць старшынёй сельсавета або ўчастковым. Я тады спытаў, чаму ён выбраў менавіта такі шлях. Ён адказаў, што часы былі ліхія, а ўчастковаму пісталет давалі! Пачынаў сваю службу ў Радашковічах, затым перабраўся ў Валожын, толькі пасля — у Маладзечна, дзе і застаўся назусім. І ўсё жыццё быў участковым. А перад пенсіяй ужо стаў старшым участковым. Тады яму і прысвоілі званне маёра міліцыі. На сваім участку ён карыстаўся безумоўным аўтарытэтам. Яго ведалі ўсе, ды і сам ён выдатна разумеў, хто чым дыхае. Бывала, зойдзе ў сталовую, бачыць, што дэбашыры выпіваюць. Тады ён звяртаўся да іх і казаў: «Сёння-заўтра — да мяне». І ніхто асабліва не супраціўляўся, не спрабаваў хавацца, збегчы, паколькі ўсе ведалі, што ён усё роўна абавязкова ўсіх знойдзе. Адслужыў у міліцыі дзед агульным чынам 33 гады».

### «ЗАЎСЁДЫ ЗАСТАВАЦЦА ЧАЛАВЕКАМ»

Служба ў міліцыі — няпростая справа. Вядома, лягчэй служыць, калі ў сям'і ёсць чалавек, які разумее спецыфіку такой работы. «Нярэдка кажуць, што цяжка быць жонкай міліцыянера або ваеннаслужачага, — прызнаецца Сяргей Руткевіч. — У маёй жонкі часта пытаюцца, як яна вытрымлівае мае начныя пад'ёмы, камандзіроўкі, частую адсутнасць. Яе бацька таксама ваенны, быў «афганец». Таму яна добра ведала, за каго замуж выходзіла. Гэтаксама і работа майго бацькі дазволіла мне хутчэй зразумець спецыфіку такой працы. Калі я жыў разам з бацькамі, давялося прывыкнуць да начных пад'ёмаў і позніх прыходаў дадому. Дзякуючы гэтаму цяпер такія мерапрыемствы ў нашай сям'і — нармальная справа. Ды і бацькоўская падтрымка заўсёды была для мяне важным плюсам. Сёння мой сын гэтак жа, як і я ў яго ўзросце, прыходзіць да мяне па параду».

Гаворачы пра асобасныя якасці, якімі павінен валодаць супрацоўнік міліцыі, Сяргей Руткевіч часта ўспамінае гісторыю са свайго мінулага: «Калі я яшчэ вучыўся ў Акадэміі МУС, адзін выкладчык заўсёды прыходзіў на заняткі ў цывільным адзенні. Мы заўжды спрабавалі здагадацца, ці служыў ён у міліцыі наогул, і калі так, то з якім званнем сышоў у адстаўку. Мы нават задавалі яму прамыя пытанні на гэтую тэму:

— Вы выйшлі на пенсію падпалкоўнікам?

— Не, бярыце вышэй.

— Палкоўнікам?

— Яшчэ вышэй.

— Ды няўжо генерал-маёрам?!

— Не, хлопцы, я на пенсію сышоў чалавекам...»

«Таму самая галоўная якасць для міліцыянера — заўсёды заставацца чалавекам, бо ў гэтай няпростай справе можна маральна перагарэць, — падкрэслівае Сяргей Руткевіч. — Таму заўсёды трэба заставацца чалавекам і ўнікаць у праблемы людзей, ставіцца да гэтага з разуменнем. Іншы выкладчык вучыў нас пакідаць сваю работу на рабочым месцы, не выносіць яе за межы КПП дадому. Скажу шчыра: гады маёй службы паказалі, што гэта практычна немагчыма. Працуючы ў аператыўным падраздзяленні, ды і ў міліцыі ў цэлым, думаю, пакінуць работу дзесьці там немагчыма. Пакуль ты дома, твае супрацоўнікі могуць працаваць на затрыманні. Тады пракручваеш самыя розныя зыходы, хвалюешся, перажываеш, чакаеш званка. І думаеш пра тое, як яны адпрацуюць, тэлефануеш, удакладняеш. Сапраўдны міліцыянер заўсёды застаецца міліцыянерам, і, нават нягледзячы на прафесійнае свята, мы застаёмся на службе. Пакуль нашы грамадзяне адзначаюць святы, мы стаім на варце правапарадку і бяспекі».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**фота Лізаветы ГОЛАД.**

*г. Маладзечна.*


**Извещение о проведении 24 марта 2025 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»**

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. номером 630/С-47149 общей площадью 647,0 кв. м (наименование – административное здание; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: бетонный подвал); капитальное строение с инв. номером 630/С-47154 общей площадью 397,2 кв. м (наименование – склад материальный; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47152 общей площадью 222,7 кв. м (наименование – склад для горюче-смазочных материалов; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47155 общей площадью 743,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47160 общей площадью 1960,9 кв. м (наименование – ремонтные мастерские; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47158 общей площадью 1360,7 кв. м (наименование – пристройка к реммастерским; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47156 общей площадью 1123,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-55558 общей площадью 35,0 кв. м (наименование – навес под баллоны; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-55622 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из силикатного кирпича (1,95 м х 2,34 м х 0,25 м) площадью 4,6 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55620 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из металлической арматуры (21,0 м х 2,69 м) площадью 56,5 кв. м, на металлических столбах (0,1 м х 2,60 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55611 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1.1. – ограждение из силикатного кирпича (13,94 м х 2,85 м х 0,25 м), 39,7 кв. м, а1.2. – ворота металлические (4,07 м х 2,85 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55610 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение бетонное (97,5 м х 1,71 м), 166,7 кв. м с 31 кирпичными столбиками с бетонными оголовками; а.1.1. – металлическая решетка (1,50 м х 1,97 м), 41,37 кв. м; а2 – ворота металлические (5,96 м х 3,70 м), 22,1 кв. м; а2.1. – калитка металлическая (1,62 м х 2,30 м), 3,73 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55608 общей площадью 7260,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из асфальтобетона); капитальное строение с инв. номером 630/С-55607 общей площадью 465,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из бетонной плитки); оборудование котельной с инв. номером 146 (котел КВЖ-02, 2 шт.; циркуляционный насос, 4 шт.; бойлер 10 куб. м, 1 шт.; топливопровод 20 м; щит управления) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,331 га, кадастровый номер – 642000000002000230 |
| Местонахождение: Минская область, Минский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33 |
| Начальная цена: 1 363 662,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 136 000,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **24 марта 2025 года в 11.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **06.03.2025 по 20.03.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам:**
**(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**
**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»)**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | СТОАО «Світанак», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 4. УНП 500041006 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**

**Нежилое здание (здание нежилое),**
инв. № 450/С-24046, общ. пл. 415,5 кв. м.
Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Я. Купалы, д. 13.** В состав лота входят **линия электропередачи** (инв. № 450/С-23996, 6,0 м), **водопроводная сеть** (инв. № 450/С-23995, 79,0 м)

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0457** га предоставлен на праве аренды по 12.07.2071 для строительства и обслуживания зданий по улице Я. Купалы, 13

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 26 653,20 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере **6 %** от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 04.04.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



Оперативная информация **ЗАО «Смолевичи Молоко»**
О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В УСЛОВИЯ КРУПНОЙ СДЕЛКИ

| | |
|---|---|
| Полное наименование акционерного общества | Закрытое акционерное общество «Смолевичи Молоко» |
| Местонахождение акционерного общества | 222201, Республика Беларусь, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Социалистическая, 54 Б |
| Дата принятия решения о внесении изменений в крупную сделку | 28.02.2025 |
| Вид сделки (каждой из взаимосвязанных сделок) | Внесение изменений в условия совершенной крупной сделки путем заключения дополнительного соглашения к договору поручительства |
| Предмет сделки | Заключение с ОАО «Сбер Банк» дополнительного соглашения № 2 к договору поручительства № 369-01106/22-09 от 26.08.2022 |
| Сумма сделки (общая сумма взаимосвязанных сделок) | 78 750 000 белорусских рублей |
| Стоимость имущества, приобретаемого (отчуждаемого) по сделке | - |
| Балансовая стоимость активов (стоимость активов), определенная на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности за последний отчетный период, предшествующий дню принятия решения о совершении такой сделки (стоимости активов) | 44 318 тыс. рублей на 31.12.2024 |

УНП 690668083



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении электронных торгов по продаже права заключения договора аренды сроком на 1 год имущества, принадлежащего **РУП «Белмедпрепараты»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 04.04.2025 в 10.00.**

**Лот № 1:**
право заключения договора аренды части изолированного помещения культурно-просветительного и зрелищного назначения площадью 6 кв. м с инвентарным № 500/D-708157565.

Адрес: г. Минск, ул. Фабрициуса, 30-13а.

Начальная цена с НДС 20 % – 26,64 руб.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by. Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182


# ДЛЯ ЎЛАСНАГА РЫНКУ І ПАСТАВАК ЗА МЯЖУ

## У РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх тэхналогій распрацавалі новыя прэпараты на аснове крыві і яе кампанентаў

Яны заменяць імпартныя і дазволяць сэканоміць сродкі на іх закупку. У прыватнасці, летась зарэгістраваны гемастатык, які выкарыстоўваецца для спынення крывацёку, і гемастатычны клей на аснове альбуміну, што прымяняюць у кардыяхірургічным лячэнні. Гэтыя і іншыя распрацоўкі спецыялістаў РНПЦ спрыяюць не толькі імпартазамяшчэнню, гэта інавацыйныя тэхналогіі, якімі валодаюць усяго 5-7 краін свету.

### ІСТОТНАЯ ЭКАНОМІЯ

Айчынны гемастатык можна прымяняць пры розных тэмпературах, ён спыняе крывацёк за 3-5 секунд. Ужо сёння ім укамплектоўваюцца ўсе аптэчкі для аказання першай дапамогі ў Беларусі. Заканчваецца яго рэгістрацыя за мяжой і плануюцца пастаўкі ў краіны СНД і далёкага замежжа.

Акрамя таго, у 2024 годзе распрацаваны гемастатычны клей на аснове альбуміну для запаўнення дэфекту касцей. Ён выкарыстоўваецца ў кардыяхірургічным лячэнні.

— На сёння замежны аналаг каштуе 600—700 долараў, наша распрацоўка — каля 80 долараў, — адзначае **Фёдар КАРПЕНКА, дырэктар РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій, галоўны пазаштатны спецыяліст па трансфузіялогіі Міністэрства аховы здароўя.**

Сёлета ўпершыню пачаліся пастаўкі ў Расію высоказапатрабаваных лекавых прэпаратаў з плазмы крыві — гэта таксама распрацоўкі РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій. У бягучым годзе будзе здадзены ў эксплуатацыю завод па вытворчасці лекавых сродкаў з плазмы крыві, ён размесціцца ў Ганцавічах на базе філіяла РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій. Выпускаць збіраюцца два прэпараты — «Альбумін» і «Імунаглабулін унутрывенны». Прэпараты дапамогуць у лячэнні і выратаванні жыццяў вялікай колькасці людзей. Плануецца, што кожны год іх будуць атрымліваць звыш 100 тысяч пацыентаў.

Прычым усё зробяць па сусветных стандартах належнай вытворчай практыкі GMP. Ні на прасторы СНД, ні ў найбліжэйшых краінах Захаду такой вытворчасці няма. Поўны цыкл перапрацоўкі будзе складаць каля 50 тон плазмы крыві ў год, якая нарыхтоўваецца на тэрыторыі краіны. Вытворчасць выбудоўвалася ў рамках рэалізацыі ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект».

Адначасова завяршаецца рэгістрацыя беларускага імунаглабуліну для ўнутрывеннага ўвядзення, ім плануецца забяспечваць пацыентаў у Беларусі. На сёння закупкі яго імпартных аналагаў абыходзяцца ў 14-15 мільёнаў долараў у год. Мяркуецца, што ў Беларусі ў 2025 годзе цалкам удасца перайсці на айчынную распрацоўку. Упершыню пачынаюцца пастаўкі гэтага прэпарату на тэрыторыю Расіі, ва Узбекістан, рэгіструюць яго вытворцы і ў краінах далёкага замежжа.

Сярод апошніх распрацовак РНПЦ і сухая плазма для аказання неадкладнай дапамогі, якая дае магчымасць на працягу 30 хвілін забяспечыць гемастаз і спыніць масіўны крывацёк. Ёй аснасцяць рэанімацыі і аддзяленні родадапамогі.



### МЕДАБСТАЛЯВАННЕ АД «АТЛАНТА»

Сумеснай распрацоўкай спецыялістаў РНПЦ ЗАТ «Атлант» з'яўляюцца спецыяльныя халадзільнікі і маразільнікі для захоўвання крыві і яе кампанентаў.

— Гэта не звычайныя халадзільнікі, а сертыфікаванае медыцынскае абсталяванне. Яно было распрацавана па тэхнічным заданні РНПЦ пад патрабаванні медыцынскіх устаноў і мае свае асаблівасці. Самая галоўная — у сістэме маніторынгу, дыягностыкі і кантролю тэмпературнага рэжыму з пастаяннай анлайн-фіксацыяй выніку. Гэта дапамагае ў выпадку збояў — адключэння электрычнасці і інш. — з аднаго боку, падтрымліваць адмоўныя тэмпературы неабходны прамежак часу, з іншага — інфармаваць персанал аб неабходнасці звярнуць увагу на няштатную сітуацыю. Гэта вельмі важна, асабліва для кампанентаў крыві і медыцынскіх прэпаратаў, — расказвае **генеральны дырэктар ЗАТ «Атлант» — дырэктар МЗХ Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК.**

Былі распрацаваны чатыры асноўныя базавыя мадэлі: маразільнікі з тэмпературай да мінус 40 градусаў, маразільнікі 28-30 градусаў з дакладным рэгуляваннем, маразільнікі ад 16 да 30 градусаў з магчымасцю працаваць пры тэмпературах навакольнага асяроддзя (ад +25 да —25 градусаў), халадзільнікі з кантролем тэмпературы. Такое абсталяванне дасць магчымасць медыкам захоўваць кроў і яе кампаненты ў кожнай медыцынскай установе і аказваць дапамогу, не чакаючы дастаўкі са спецыялізаваных устаноў.

ДОБРАЯ НАВІНА

# НА КАРЫСЦЬ ЗДАРОЎЯ

Навагрудская раённая бальніца аснашчана новым медыцынскім абсталяваннем.

Парк абсталявання Навагрудскай цэнтральнай раённай бальніцы папоўніўся. У прыватнасці, літаральна днямі тут з'явіўся электрахірургічны генератар расійскай вытворчасці. Ён прызначаны для работы са страўнікава-кішачным трактам, у прыватнасці для рассякання тканак і спынення крывацёкаў, пры гэтым забяспечвае высокую якасць аперацый у спалучэнні з максімальнай бяспекай.

Сфера прымянення такога абсталявання дастаткова шырокая. Яго выкарыстоўваюць у розных галінах медыцыны: ад агульнай хірургіі і гінекалогіі да афтальмалогіі, пластычнай і сківічна-тварнай хірургіі. У Навагрудскай цэнтральнай раённай бальніцы апарат устаноўлены ў эндаскапічным кабінеце хірургічнага корпуса.



Фота БелТА.

**Урач-эндаскапіст Навагрудскай цэнтральнай раённай бальніцы Антон ЛАЗАР.**

— Наяўнасць дадзенага апарата ў арсенале спецыяліста-эндаскапіста складана пераацаніць. Ён гарантуе бяспечнае, хуткае і зручнае выдаленне новаўтварэнняў страўнікава-кішачнага тракта, мінімізуючы рызыку развіцця такіх ускладненняў, як крывацёк, — расказаў **урач-эндаскапіст Навагрудскай цэнтральнай раённай бальніцы Антон ЛАЗАР.** — Гэта адбываецца за кошт імгненнай каагуляцыі тканак, якія рассякаюцца, электрычным токам. Апарат дазваляе кропкава выдаляць невялікія паталагічныя ўчасткі без рызыкі перфарацыі сценак полага органа, якія звычайным спосабам выдаліць немагчыма ці вельмі небяспечна. Акрамя таго, апарат дае магчымасць правядзення некаторых іншых больш складаных маніпуляцый на органах страўнікава-кішачнага тракта.

Электрахірургічны генератар стаў дадаткам да дыягнастычнага комплексу Sonoscape HD-500, якім летась была абсталявана цэнтральная раённая бальніца Навагрудка. З новым апаратам магчымасці значна пашырыліся.

— Сёння кабінет укамплектаваны цалкам. Нашы ўрачы могуць аказваць поўны комплекс эндаскапічнай медыцынскай дапамогі насельніцтву раёна: ажыццяўляць дыягностыку, у тым ліку ранняе выяўленне анказахворванняў, праводзіць хірургічныя маніпуляцыі. Па ўзроўні і якасці медыцынская дапамога не адрозніваецца ад той, якая аказваецца ў стацыянарах абласных цэнтраў, — адзначыў **галоўны ўрач Навагрудскай цэнтральнай раённай бальніцы Алег АНЦУХ.**

**Алена КРАВЕЦ.**

# СВАЯ ЛАЗА

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Айчынных тэхнічных сартоў вінаграду, прызначаных для перапрацоўкі і вырабу сухіх сталовых напояў, дагэтуль у Беларусі не было. «Лорэд» атрыманы шляхам клонавай селекцыі на аснове знакамітага старадаўняга сорту «Маршал Фош». Да нядаўняга часу задача атрымання айчынных сартоў вінаграду перад селекцыянерамі не ставілася, расказвае навуковец. Культура не разглядалася як прамысловая — толькі ў фармаце аматарскага вырошчвання.

— Сёння ў селекцыі вінаграду мы робім упор на сарты тэхнічнага кірунку, прыдатныя для перапрацоўкі на сокі і моцныя напоі, — кажа Уладзімір Усцінаў. — На гэта нас нацэльвае Акадэмія навук.

Два гады ў нашай краіне дзейнічае праграма, што фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага інавацыйнага фонду, мэта якой — стварыць высокаўраджайныя зімаўстойлівыя тэхнічныя сарты, распрацаваць прыёмы размнажэння і вырошчвання вінаграду, прыдатнага для вырабу сталовых сухіх напояў. Але селекцыйны працэс патрабуе больш доўгага часу, адзначае суразмоўнік. Першы беларускі тэхнічны сорт некалі «пачуўся» як пошукавы эксперымент, якіх у Інстытуце пладаводства закладваецца шмат...

Дарэчы, «Лорэд» — гэта абрэвіятура, расшыфроўваецца яна «Лойка Рамуальд Эдуардавіч». Сорт названы ў гонар выдатнага беларускага селекцыянера, доктара сельскагаспадарчых навук, які ў свой час стаяў каля вытокаў сучаснай селекцыі вінаграду ў краіне.

## АД МАРЫ ДА МЭТЫ

Наша краіна і сёння — зона непрамысловага вырошчвання вінаграду: усё ж гэта паўднёвая расліна, і беларускі клімат для яе — жорсткі. Мяжа паўночнага аматарскага вінаградарства яшчэ 30 гадоў таму праходзіла праз Магілёў, Мінск і Гродна, перакрэсліваючы краіну ўпоперак: на поўдзень ад яе «сонечную лазу» вырасціць было можна, на поўнач — не, як ні імкніся. Сёння вінаград у нашай краіне расце ва ўсіх абласцях: спрыяюць і праславутае пацяпленне, і сучасныя агратэхнічныя прыёмы. Што датычыцца прамысловых вінаграднікаў, то навукоўцы праводзяць іх паўночную мяжу яшчэ далей на поўдзень, па 52-й паралелі — гэта амаль самы край Берасцейшчыны і Гомельшчыны.

Тым не менш развіццё прамысловага вінаградарства ў Беларусі магчыма, перакананы Уладзімір Усцінаў, як і вінаграднае вінаробства з уласнай сыравіны. Важна толькі засяродзіцца на сартах ранняга тэрміну паспявання, і, вядома, неабходныя сарты ўласнай селекцыі.



Ідэальныя ўмовы для прамысловага вінаградарства ў рэгіёнах, дзе сума актыўных тэмператур з пачатку вегетацыі да збору ўраджаю перавышае 3000 градусаў, адзначае ён. У нашай краіне, у раёне Мінска, гэта сума традыцыйна складае 2400 градусаў. Хоць у апошнія гады — стабільна вышэйшая за 2,5 тыс. градусаў, а часам дасягае 2,7-2,8, кажа навуковец.

— І гэтыя «лішнія» 100—200 градусаў для вінаграду — нялішнія, — падкрэслівае суразмоўнік.

Наогул, ахвотныя вырасціць паўнаважкія вінаградныя гронкі на беларускай зямлі знаходзіліся заўсёды. Так, першая пісьмовая згадка пра культуру вінаграду на тэрыторыі сучаснай Беларусі адносіцца аж да XI стагоддзя: гэта распараджэнне епіскапа ігумену Тураўскага манастыра аб укрыцці вінаграднікаў на зіму. Спрабавалі вырошчваць вінаград і Радзівілы ў сваім маёнтку «Альба» непадалёк ад Нясвіжа — пра гэта захаваліся звесткі ў адной з крыніц 1767 года. Імкненне (з рознай ступенню поспеху) разбіваць вінаграднікі, здаецца, было адным з модных дзівацтваў таго часу: захаваліся звесткі пра вінаграднікі ў Іўі, Прылуках, Докшыцкім і Пастаўскім раёнах, Слоніме, Маладзечне, Карэлічах...



**Навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства» Уладзімір УСЦІНАЎ.**

Заставаўся жаданай мэтай беларускі вінаград і ў XX стагоддзі. Бурнае развіццё навукі тады дазволіла дамагчыся ў гэтай галіне пэўных поспехаў. Так, на Усебеларускай выставе 1930 года былі прэзентаваныя спелыя гронкі вінаграду. Вырошчвалі вінаград у саўгасе «Рудакова» Брагінскага і «Воля» Веткаўскага раёнаў, а таксама ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Навуковыя даследаванні па гэтай культуры былі распачаты Акадэміяй навук БССР тады ж, а першыя вынікі абагульнены перад Вялікай Айчыннай вайной у кнізе 1940 года «Развядзенне вінаграду ва ўмовах Беларусі».

Ну а пачатак XXI стагоддзя, магчыма, застанецца ў гісторыі беларускага вінаградарства як важная вяха — з'яўленне ўласнай сыравіны для класічнага вінаробства.

— На мацярынскія формы сорту «Маршал Фош» мы звярнулі ўвагу даўно, — адзначыў Уладзімір Мікалаевіч. — Сорт быў прывезены ў Беларусь у 1998 годзе, у 2014-м — уключаны ў Дзяржрэестр. Але кожны стары сорт схільны да выраджэння: назапашваюцца вірусы і хваробы, зніжаецца ўраджайнасць і якасць пладоў. Патрэбны новыя прадукцыйныя сарты са стабільнай высокай ураджайнасцю.

Размерныя характарыстыкі гронак у сорту «Маршал Фош» — да 100 г (у тэхнічных сартоў наогул гронкі небуйныя, тлумачыць навуковец). У сорту «Лорэд» беларускай селекцыі гронкі перавышаюць 100 г, а асобныя — дасягаюць 200 г.

## НАСЫЧАНЫ СМАК

Сёння ў РУП «Інстытут пладаводства» ў Самахвалавічах сабрана калекцыя з 541 сартаўзору вінаграду селекцыі 25 краін свету: практычна ўсё з сартоў і гібрыдаў гэтай культуры, што можна вырасціць на беларускай зямлі. Гэта і сталовыя сарты — для спажывання ў свежым выглядзе, і тэхнічныя, прызначаныя менавіта для вінаробства. Уладзімір Мікалаевіч адзначае, што хоць аб густах не спрачаюцца, сам ён нават проста па смакавых якасцях аддае перавагу менавіта тэхнічным сартам. У сталовага вінаграду, вядома, буйнейшыя ягады і больш важкія гронкі, але смак, як правіла, прасцейшы. Тэхнічныя ж — адрозніваюцца складаным смакам з мноствам «тонаў» і «падтонаў».

Дарэчы, смак сорту «Лорэд» — насычаны ягадны, з «бургундскімі» ноткамі. Сок прыгожа афарбаваны і вызначаецца досыць высокай цукрыстасцю (23—26 Brx).

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## Извещение о проведении 9 апреля 2025 года торгов на право размещения средств рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, расположенных в Первомайском районе г. Минска

| Место размещения средства рекламы (согласно поадресной инвентаризации лифтов) | Вид средства рекламы (согласно техническому заданию) | Размер средств рекламы | Площадь рекламного поля, кв. м | Количество средств рекламы, единиц | Начальная цена предмета торгов (с учётом НДС)/ сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лифтовые кабины жилых домов, расположенные в Первомайском районе г. Минска | Антивандальный стенд (лифтборд) – 1 304 шт. | 594*420 мм (А2) – в лифтах грузоподъемностью до 400 кг | 0,25 | 1 304 | 16 430,40 |
| | | 630*594 мм (6 А4) в лифтах грузоподъемностью от 400 до 630 кг | 0,37 | 0 | |
| | | 841*594 мм (А1) в лифтах грузоподъемностью 630 кг и выше | 0,50 | 0 | |

**Срок действия договора – 1 год** со дня подписания его сторонами без права продления.

**Уполномоченное лицо по управлению общим имуществом совместного домовладения –** коммунальное унитарное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство Первомайского района г. Минска», г. Минск, ул. Кедышко, дом 27, тел. (029) 388-93-07.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Форма проведения торгов** – аукцион на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов на право размещения средств рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, утвержденным организатором торгов.

Аукционные торги проводятся **9 апреля 2025 г. в 11.00,** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).

Документы на участие в торгах принимаются с 04.03.2025 г. **по 07.04.2025 г.** включительно, в рабочие дни – с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00), по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах;
- копию платежного документа о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов;
- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, (назначение платежа – задаток для участия в торгах на право размещения средств рекламы, назначенных на 09.04.2025 г.).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются:

физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (единственный участник торгов) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** оплатить вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов;
- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет уполномоченного лица по управлению общим имуществом совместного домовладения сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг уполномоченного лица по управлению общим имуществом совместного домовладения по размещению рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с договором на оказание услуг по размещению рекламы);
- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор на оказании услуг по размещению рекламы с уполномоченным лицом по управлению общим имуществом совместного домовладения (при условии внесения платы за предмет торгов и перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефон для справок:** (017) 360-42-22 – отдел аукционов (по вопросам организации и проведения торгов).

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

Дополнительная информация и поадресная инвентаризация лифтов размещены на сайте организатора торгов: **www.mgcn.by** (раздел АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции/Файлы).

*«Мы дамовіліся: колькі заробіце, столькі ж з бюджэту атрымаеце. Так? Што яшчэ трэба?.. 50 працэнтаў мы даём тэатрам датацый.»*

*Аляксандр Лукашэнка на нарадзе з кіраўніцтвам Савета Міністраў.*
*14 лютага 2023 года.*

# «Мастацтва павінна мець сваю цану»

З 1 студзеня 2025 года стварэнне новых тэатральных пастановак, правядзенне гастроляў, аплата камунальных паслуг, эксплуатацыйных расходаў і выплата заработнай платы будуць ажыццяўляцца на парытэтнай аснове (50/50) са сродкаў бюджэту і уласных даходаў тэатраў. Аб гэтым гаворыцца ва Указе № 422 Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ад 18 лістапада 2024 года.

Якім чынам тэатры могуць выканаць пастаўленую задачу? **Генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Кацярына ДУЛАВА** на сустрэчы з журналістамі растлумачыла:

— На сцэне Вялікага тэатра Беларусі ў 2024 годзе было праведзена 357 мерапрыемстваў, пры тым што ў план закладвалі 350. Абслужылі мы 245 тысяч гледачоў, гэта значыць, тэатр наведала чвэрць мільёна жыхароў розных краін, найперш грамадзян Рэспублікі Беларусь (у плане было 224 тысячы гледачоў). Калі пра нашы перспектывы ў кантэксце новай сістэмы фінансавання тэатраў... Па выніках мінулага года да 1 студзеня па долі пазабюджэтных даходаў мы павінны былі выйсці на лічбы 60 на 40. Але мы атрымалі 45 %! За гэты год мы павінны выйсці на лічбу 50 на 50 %.

Хачу адзначыць, што сярэдняя заработная плата ў Вялікім тэатры вырасла амаль на 18 % з мінулага года і сёння яна складае 2290 рублёў. Што да росту экспарту тавараў і паслуг, то ён склаў 100 %, гэта $244 000 ЗША. 41 гастрольнае выступленне калектыў тэатра правёў за 2024 год. З іх 26 — па Рэспубліцы Беларусь (даходаў сабе і краіне мы прынеслі 327 мільёнаў). Наведалі Віцебск, Добруш, Нясвіж, Бярозу, Мазыр і гэтак далей. 15 выступленняў было за мяжой, сума даходаў склала 419 мільёнаў (Расійская Федэрацыя, Рэспубліка Нікарагуа і Кітайская Народная Рэспубліка).

У 2024 годзе тэатр атрымаў амаль 430 мільёнаў рублёў бязвыплатнай спонсарскай дапамогі. Вельмі важна тое, што нам удалося частку спонсарскай дапамогі накіраваць на ўзнагароду нашым артыстам дзякуючы Указу Прэзідэнта, які гаворыць аб пераходзе на новую сістэму. Такая форма заахвочвання вельмі важная для тых, хто сёння з'яўляецца асобай тэатра, на каго ідзе публіка, і чыя дзейнасць прыносіць нам асноўны даход.

Уступіўшы ў новую сістэму фінансавання, мы разумеем, дзе можам пачаць эканоміць без страт для дзейнасці тэатра. Нейкія падраздзяленні тэатра можна было б вывесці са штатнага раскладу і ператварыць іх у наймальныя структуры. Не буду ўтойваць, мы праводзім вельмі сур'ёзную палітыку па кантролі развіцця творчых труп. У нас конкурсная сістэма, акрамя таго, праслухоўваем і прагледаем нашых артыстаў розных узроставых катэгорый. Хтосьці бянтэжыцца, хтосьці абураецца. Але знаныя асобы Вялікага тэатра з вялізным задавальненнем ідуць на кантрольныя праслухоўванні. Гэта неабходна, калі мы сёння вымушана ідзём на крокі па павышэнні ў тым ліку кошту квіткоў і пашырэнне гастрольнага графіка. Тэатр упершыню выступіў і на сцэне Марыінскага і Вялікага тэатраў Расіі, і я выдатна разумею, што за гэтым стаіць якасць. Тое ж самае датычыцца і аркестра: мы ўвесь час у стане конкурснага праслухоўвання, каб выканаўцы падтрымлівалі адпаведную форму. Нездзе пераглядаем нагрузкі артыстаў, іх занятасць. Акрамя таго, прыдумляем новыя праекты, якія павінны прынесці даход.

Лічу, што нам трэба актывізаваць работу з Міністэрствам спорту і турызму. Вялікі тэатр Беларусі павінен быць уцягнуты ў зону культурнага турызму. Да нас можна прыходзіць не толькі на спектаклі, але і на экскурсіі. Таксама мы сталі актыўна прапаноўваць выступленні нашых заслужаных артыстаў па лініі прафсаюзаў, напрыклад у санаторыях, прафілакторыях, дамах культуры. Унутры тэатра фарміруем творчыя калектывы, якія, выязджаючы, таксама будуць зарабляць. Адзін з такіх калектыў быў уладальнікам гранта Прэзідэнта.

Разумеем, што ёсць розныя катэгорыі гледачоў, але высокае мастацтва не можа каштаваць як кубак кавы ці як білет у кіно. Мастацтва, якое на вашых вачах ствараюць жывыя людзі дзякуючы сваім галасам, целам, здароўю, павінна мець сваю цану. Мы зараз распрацоўваем сетку, каб гледачы розных сацыяльных груп маглі прыходзіць у тэатр па прымальных цэнах. Адкрылі серыю дабрачынных спектакляў і вечароў. З іншага боку, ёсць катэгорыя грамадзян, якія патрабуюць да сябе большай увагі і гатовы за гэта плаціць. Цяпер мы думаем наконт vip-паслуг. Напрыклад, чалавек просіць, каб яго прыпаркавалі, правозділі ў гардэроб, а потым на месца ў зале. Ці хоча набыць цалкам ложу. Цяпер пралічваем, які можа быць кошт. Распрацавалі таксама падарункавыя сертыфікаты на 50 і 100 рублёў. Будзем прыцягваць розныя формы працы, якія існуюць у свеце.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

ПРЭМ'ЕРА

# МУЛЬТФІЛЬМ — НЕ ЗАЎСЁДЫ КАЗКА

**17 хвілін грамадазнаўства: на «Беларусьфільме» вырашылі расказаць дзецям пра дзяржаўныя святы і сімвалы**

Сур'ёзна падышлі маленькія гледачы да культпаходу ў кінатэатр «Піянер», дзе адбывалася ўрачыстае прадстаўленне прэм'ернай анімацыйнай стужкі «Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь. Каляндар свят». Вядома, назва абавязвае. Але такое адчуванне, што ўсе былі гатовыя да своеасаблівай віктарыны, якая адбывалася ўпачатку. Ці то сапраўды, нягледзячы на ўзрост, малыя ўжо ведаюць адказы на пытанні, што датычацца дзяржаўнага будаўніцтва? Ці, можа, адмыслова рыхтаваліся? Альбо тут адразу трэба разумець: гэта беларускія дзеці. Адказы яны выкрыквалі ледзь не хорам, калі кароль і каралева (гульнявыя персанажы) задавалі сур'ёзныя пытанні на веданне таго, што такое... Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, навошта яна патрэбна; што такое Дзень Незалежнасці, навошта створаны Музей Вялікай Айчыннай вайны і гэтак далей. Гэта была толькі размінка, якая засведчыла: да прагляду мультфільма яны будуць гатовыя. І сам сабой прыходзіць на розум працяг гэтай фразы: заўсёды гатовыя. Так выхоўваюць грамадзян Рэспублікі Беларусь.

А мультфільм — адзін са сродкаў выхавання. Гэты мультыплікацыйны фільм складаецца з шасці эпізодаў, у кожным з якіх дарослыя — тата з мамай ці дзядуля — распавядаюць самым маленькім дзеткам пра нейкую асаблівую дату ці сімвал краіны. Кожная з гэтых частак можа быць паказана асобна, калі для гэтага ёсць нагода. Ідэя фільма



належыць дырэктару «Беларусьфільма» Юрыю Аляксею, адзначыла падчас сустрэчы з малымі гледачамі рэжысёр Алена Турава. Паводле яе слоў, над стужкай (яна доўжыцца 17 хвілін. — **«Зв.»**) каля года працаваў даволі вялікі калектыў аніматараў, сярод якіх ёсць тыя, для каго гэта праца стала дэбютам у рэжысуры.

— Мы на студыі анімацыйных фільмаў робім розныя стужкі: казкі, фільмы, прысвечаныя важным асобам нашай краіны; таксама распавядаем пра значныя для яе падзеі, — сказала Алена Турава. — У тым ліку ствараем фільмы, у якіх расказваецца пра важныя рэчы, што дапамагаюць вырасці добрымі, мужнымі, смелымі, адказнымі асобамі, якія любяць сваю радзіму.

Пачынаецца расповед з сюжэта пра Дзень Канстытуцыі: хлопчыку трэба намаляваць паштоўку да гэтага свята, а ён не разумее, што яно значыць. Што ж, мудры бацька расказвае яму і меншай сястрычцы пра тое, што такое правы і законы, чаму і дзеля чаго іх прыдумалі людзі, і калі быў прыняты Асноўны Закон у Беларусі. Вось такі кароткі экскурс ў гісторыю, які пераходзіць фактычна ва ўводзіны ў грамадазнаўства.

Пра якія яшчэ дзяржаўныя святы расказваюць стваральнікі? Ёсць часткі пра Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі, Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дзень народнага адзінства. І асобны расповед — пра дзяржаўныя сімвалы. Уявіце сабе: дзеці з маленства разумеюць, што ёсць не толькі папулярныя ў народзе нефармальныя сімвалы нашай краіны, такія як дранікі, валошка ці зубр. Беларускія дзеці пазнаюць сімвалы, замацаваныя на дзяржаўным узроўні, і ўжо ведаюць, што трэба рабіць, калі гучыць гімн...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже земельного участка в частную собственность с расположенным на нем не завершенным строительством незаконсервированным капитальным строением в г. Марьина Горка Пуховичского района

**Организатор электронных торгов:** Пуховичский районный исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, тел.: (801713) 35645, 35427; 8 (033) 9029538.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by. Дата проведения электронных торгов: **4 апреля 2025 года.**
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, *руб.* | Задаток, *руб.* | Расходы по подготовке, *руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, пер. Боровой, У-2.28** | 624450100001003987, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1000 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 18 837,22 | 1 883,72 | 2 079,36 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **1 апреля 2025 года, до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола, а также заключает с ним договор аренды земельного участка – в случае проведения электронных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры»

# «НАС НАЗЫВАЛІ ПАКАЛЕННЕМ ПЕРАМОЖЦАЎ...»

**Выстаўка «За мірнае неба!» адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы**



Экспазіцыя прысвечана 80-годдзю Перамогі. Яе мэта — расказаць пра гераічнае супраціўленне і подзвіг беларускага народа. Да падрыхтоўкі гэтага маштабнага праекта далучыліся Нацыянальны архіў Беларусі, кінастудыя «Беларусьфільм», Беларускі саюз мастакоў і 13 музеяў краіны.

Як паведаміла **намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Людміла ВЫСОЦКАЯ**, экспазіцыя — даніна памяці тым, хто адстаяў мір. Яна знаёміць не толькі з найважнейшымі бітвамі, але і з побытам удзельнікаў вайны. Можна даведацца, як яны адзяваліся, якімі прадметамі карысталіся і нават як займаліся творчасцю.

Сярод музеяў, якія прадставілі для выставачнага праекта «За мірнае неба!» артэфакты са сваіх фондаў, — мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». **Загадчыца навукова-экспазіцыйнага аддзела мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Святлана ДРАНЕВІЧ** расказала пра адзін ліст, які прыйшоў у музей ужо ў 2020 годзе ад Пятра Кацельнікава — былога выхаванца музыканцкага ўзвода. Калі пачалася вайна, яму было дванаццаць гадоў. «Нас называлі пакаленнем пераможцаў, але мы былі звычайнымі людзьмі. Не для крывавых бітваў, сусветнай славы раслілі нас маці, а для звычайнага горднага жыцця. Але лёс распарадзіўся па-іншаму. Гэта не мы выбралі час. Гэта час выбраў нас», — напісаў мужчына. Менавіта такім героям і прысвечана выстаўка. Яна дае магчымасць даведацца пра тое, які ўнёсак у Перамогу зрабілі ўраджэнцы розных абласцей і як памяць пра іх захоўваецца ў рэгіёнах.

У экспазіцыі змешчаны дакументы, асабістыя рэчы і ўзнагароды ўдзельнікаў вайны, фатаграфіі, рукапісныя часопісы, лісты, артыкулы і нарысы ваеннага і пасляваеннага перыяду.

Праз прызму літаратурных і дакументальных твораў паказаны значныя бітвы — Сталінградская, Курская, Бітва за Маскву, аперацыя «Баграціён». Гераізм і трагедыя беларускага народа адлюстраваны і ў работах мастакоў. Кінастудыя «Беларусьфільм» прадставіла рэканструкцыю ваеннай формы 1941—1944 гадоў, рэквізіт, які выкарыстоўваўся пры здымках ваенных фільмаў.

Намеснік дырэктара Нацыянальнага архіва Беларусь Святаслаў Кулінок, расказаў, што ў архіве сёння захоўваецца асноўны комплекс дакументаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, падпольным і партызанскім рухам, акупацыйным перыядам і палітыкай генацыду. Сёння, калі ў свеце вядуцца войны з памяццю, вельмі важна зрабіць усё магчымае, каб гістарычную праўду перадаць наступнаму пакаленню. Для новага выставачнага праекта ў архіве былі адабраны адны з самых знакавых дакументаў, якія дазваляюць паглыбіцца ў гісторыю; убачыць, як у першыя месяцы вайны партыйнае кіраўніцтва абмяркоўвала напад на Савецкі Саюз, пытанні эвакуацыі. Прадстаўлены дакументы, звязаныя з партызанскім рухам, са знішчэннем гаўляйтара Вільгельма Кубэ, з трагедыяй беларускага народа.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## ЗВЯЗДА. ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ

***«Звязда». № 43 — 4 сакавіка 1945 года***

### • На фронце

Войскі 2-га Беларускага фронту працягвалі наступленне. Іх баявыя подзвігі залатымі старонкамі ўвайшлі ў летапіс Айчыннай вайны. Ламаючы шалёнае супраціўленне ворага, руйнуючы на сваім шляху яго бастыёны і крэпасці, армія-вызваліцельніца ішла ўперад і граміла ворага ў яго ўласнай бярлозе. Праціўнік жа, імкнучыся затрымаць прасоўванне нашых войскаў, кідаў у бой рэзервы.

«**Палонныя паведамляюць, што нямецкае камандаванне аддала сваім войскам загад любой цаной не дапусціць выхаду савецкіх войск да Балтыйскага мора**», — пісала наша газета.

Жорсткія баі, паводле звестак Саўінфармбюро, адбываліся ўвесну на подступах да горада Румельсбург. Фашысты сканцэнтравалі тут буйныя сілы і зладзілі контратаку ў заходнім напрамку. Яны разлічвалі адным ударам адкінуць нашы войскі. Аднак гэтая задума гітлераўцаў была сарваная. «**Савецкія артылерысты і пехацінцы адбілі варожую контратаку. Затым нашы войскі нанеслі праціўніку імклівы ўдар і пасля ўпорнага бою авалодалі горадам Румельсбург. Развіваючы поспех, франтавікі прасунуліся на 15 кіламетраў і штурмам занялі горад Полноў. Гэтыя гарады былі важнымі вузламі камунікацый і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў у Памераніі**». 3 сакавіка нашы войскі таксама з баямі занялі больш за 80 іншых населеных пунктаў, сярод якіх былі і буйныя — Грос, Пецеркау, Штарзен, Грос Швірзен, Кураў, Дарген.

На тэрыторыі Чэхаславакіі, на паўночным захадзе і захадзе ад горада Лучанец, франтавікі з баямі занялі населеныя пункты Очова, Калінка, Кралеўцэ, Прэнчоў, Белуй, Пачувадла, Угліска, Брэгі.

«**У ходзе баёў праціўнік нясе вялікія страты. За дзень знішчана звыш 2000 нямецкіх салдат і афіцэраў. Падбіта і спалена 20 танкаў праціўніка. Захоплена многа трафеяў і ёсць палонныя**», — пісала «Звязда», паводле звестак Савецкага інфармбюро.

### • У тыле

Загад Сталіна да 27-й гадавіны Чырвонай Арміі ўзброіў народ і армію праграмай барацьбы і працы. «**Вялікі правадыр адзначыў гістарычныя поспехі ўзброеных сіл савецкай дзяржавы, даў малюнак грандыёзнага наступлення Чырвонай Арміі ў апошнія месяцы, якое набліжае дзень канчатковай перамогі над ворагам. Адначасова ў сваім загадзе таварыш Сталін паставіў задачы перад арміяй і народам, выкананне якіх прывядзе да поўнага крушэння гітлераўскай Германіі**».

«Звязда» пісала, што беларускі народ сустрэў гэты загад «з неперадаваным уздымам». Па ўсёй рэспубліцы пракацілася хваля мітынгаў і сходаў, на якіх выступалі сотні і тысячы прамоўцаў — рабочыя, калгаснікі, інтэлігенты. «**У адзін голас гаварылі яны аб радасці нашых перамог, аб сваёй рашымасці ўсе сілы аддаць на свяшчэнную справу разгрому нямецкіх катаў**». **І гэта былі не проста словы. Гэта была клятва народа.**

Пра новыя факты паспяховай работы ў адказ на загад Сталіна паведамлялася ў 43-м нумары нашай газеты. Кожны з іх — сведчанне таго парыву, які быў ахоплены наш народ у тыя цяжкія, жудасныя дні. «**У найкарацейшы час мы павінны аднавіць гаспадарку рэспублікі, паверску разбураную нямецкімі захопнікамі**», — пісала «Звязда».

«**...Звонам піл і стукам тапароў шумелі лясы Крупскага раёна. На трактах і лясных дарогах скрыпелі палазы, на румах і пагрузачных станцыях звінелі стромкія хвоі і бомы... Да 500 лесарубаў і звыш 900 возчыкаў лесу сваёй штодзённай і напружанай работай дабіваюцца датэрміновага выканання важнага дзяржаўнага задання**».

Работа была напружаная. Неабходна было, паводле публікацыі, нарыхтаваць 18 тысяч кубаметраў будаўнічага лесу і паліва, вывезці і падвезці да чыгуначных станцый і сплаўных участкаў 35 тысяч кубаметраў драўніны. На дапамогу ў арганізацыі лесанарыхтовак былі мабілізаваныя работнікі з ліку раённага партыйнага і савецкага актыву. Па ініцыятыве калгаснікаў Шэйскага сельсавета ў раёне быў аб'яўлены франтавы месячнік па выкананні плана лесанарыхтовак.

«**У кожным калгасе арганізавалі сталыя брыгады лесарубаў і возчыкаў. Паміж возчыкамі і кожнай парай лесарубаў заключылі індывідуальныя сацдагаворы і вынікі іх выканання падводзім штодзённа пасля работы. Для заахвочвання лепшых стаханаўцаў — лесарубаў і возчыкаў — стварылі ў кожным калгасе спецыяльны прэміяльны фонд грошай, хлеба і промтавараў. Да кожнай брыгады лесарубаў і возчыкаў прымацавалі чытчыкаў газет і агітатараў**».

Словы савецкага чалавека — цвёрдае слова. Пасля таго як людзі ўзялі на сябе абавязацельствы па аднаўленні гаспадаркі, пачалася барацьба за іх выкананне і перавыкананне.

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**


## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток (10 %), бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1787 | Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-23061 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание водогрейной, общая площадь – 20,9 кв. м, составные части и принадлежности – Благоустройство) | 11016,00 | 1101,60 | 550,80 |
| 1864 | Ванна для импрегнации древесины JHV-3, инв. № 30135 | 5292,00 | 529,20 | 264,60 |

В отношении лота № 1787 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 15 %.** В отношении лота № 1864 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 21 (30409) от 31.01.2025 г., стр. 15

**Местонахождение лота № 1787:** Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 3Д.
**Местонахождение лота № 1864:** Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3Б

Лот № 1787 расположен на земельном участке с кадастровым номером 123450100001004339, площадь 0,6501 га, целевое назначение – для обслуживания здания «Здание водогрейное». Право постоянного пользования. Ограничения (обременения): земельные участки, расположенные в охранных зонах объектов газораспределительной системы, код – 5,7, площадь – 0,0180 га

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **17 марта 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55),** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 4 марта 2025 года до 16.00 13 марта 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ООО «Профитсистем», проводимых 17.03.2025 г.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимается в рабочие дни, с 10.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %; комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения торгов. **Вознаграждение аукциониста: по лоту № 1864 – 8 %, по лоту № 1787 – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 14 (четырнадцати) календарных дней (по лоту № 1864) и не позднее 30 (тридцати) календарных дней (по лоту № 1787) со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375 (29) 5295202 Сергей (пн – пт, с 10.00 до 13.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 г. № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (17) 3958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# ШОУ ЗАМЕСТ ПЕРАГАВОРАЎ

## Рэаліці-шоу з Авальнага кабінета Белага дома, або Як ЗША па-майстэрску пераклалі праблемы Украіны на Еўропу

Калі вярстаўся матэрыял «Гульня за рэсурсы» (№ 42 (30 430) ад 1.03.2025) у суботні нумар газеты, перагаворы ў Авальным кабінеце Белага дома паміж Трампам і Зяленскім па падпісанні дагавора аб доступе ЗША да прыродных рэсурсаў Украіны яшчэ не пачаліся: адбіваецца ўсё ж такі розніца ў часавых паясах. Таму ніхто выказаць здагадку не мог пра тую драму, якая там разыграецца.



### ВІРТУОЗНЫ САСКОК

Самае галоўнае, што ў прамым эфіры ўвесь свет убачыў сапраўды ўзрушальнае шоу, дзе ЗША віртуозна не толькі саскочылі з фінансавання канфлікту ва Украіне, пераклаўшы пры гэтым усю адказнасць (як за падтрымку Кіева, так і наступнае яго паражэнне ў вайне) на плечы недальнабачных еўрапейскіх палітыкаў, але і прадэманстравалі сябе як галоўнага міратворца планеты. Пры гэтым яшчэ і выставілі ў непрывабным святле ўкраінскага прэзідэнта, які з'явіўся на сустрэчы ў світары, парушыўшы тым самым усе нормы дрэс-кода для падобных мерапрыемстваў, стаў хаміць Трампу і Вэнсу, выказваючыся часам нецэнзурна.

Як вынік гэтай унікальнай падзеі для Белага дома за ўсю гісторыю яго існавання — Зяленскі стаў першым і адзіным прэзідэнтам, нягледзячы на тое, што краіны, які быў з ганьбай з яго выгнаны. Што яшчэ больш зневажальна, дык гэта тое, што словы Трампа Зяленскаму перадалі дзяржсакратар ЗША Марка Рубіо і дарадца ў нацыянальнай бяспецы Майкл Уолтц. Амерыканскі лідар проста адмовіўся далей мець зносіны з украінскім прэзідэнтам, марнаваць на яго свой час.

Услед за гэтым прэс-сакратар Белага дома Кэралайн Лівіт агучыла афіцыйную пазіцыю Белага дома: «Зяленскі прыбыў на сустрэчу з Трампам без жадання весці перагаворы аб міры ва Украіне, ён быў варожы і грубы». А спікер палаты прадстаўнікоў Кангрэса Майк Джонсан сказаў фразу, ад якой прэзідэнту «незалежнай» можна рваць на сабе валасы і пасыпаць галаву попелам: «Зяленскаму трэба прыйсці ў сябе і вярнуцца за стол перагавораў з ЗША з удзячнасцю альбо хтосьці іншы павінен узначаліць (яго) краіну»...

### ЗАЧЫСТКА ПАЛІТЫЧНАГА ПОЛЯ

Безумоўна, найбольшую выгаду з неадэкватных паводзін Зяленскага атрымаў Трамп. У яго цяпер цалкам развязаныя рукі ў дачыненні не толькі да Украіны і яе кіраўніцтва, але і да сваіх амерыканскіх ворагаў. Напрыклад, ён спакойна можа ініцыяваць маштабныя расследаванні адносна дапамогі, якая вылучалася «незалежнай» байдэнаўскай адміністрацыяй, з прызначэннем або пошукам вінаватых.

Дарэчы, падобна, менавіта гэта ён ужо і пачаў рабіць. Літаральна днямі новы дырэктар ФБР Патэль даручыў Кангрэсу расследаваць, куды сышлі сотні мільярдаў долараў, адпраўленых ва Украіну. Па словах галоўнага амерыканскага федэрала, ёсць «сур'ёзныя падставы для турботы, бо Украіна з'яўляецца асяроддзем карупцыі і адмывання грошай».

Характэрна, што галоўны амерыканскі русафоб і найлепшы сябар Зяленскага, заўзяты антытрампавец сенатар Ліндсі Грэм, вельмі хутка зразумеў, куды хіліць Трамп і літаральна пераабуўся ў скачку, заявіўшы, што Зяленскі сваімі паводзінамі ў Белым доме зрабіў амаль немагчымай дапамогу з боку ЗША. «Я ніколі так не ганарыўся Трампам за тое, што ён паказаў амерыканскаму народу і ўсяму свету, што з гэтым чалавекам нельга жартаваць», — падкрэсліў Ліндсі Грэм.

### ШОК І АБУРЭННЕ

Рэакцыя ж сусветных палітыкаў на скандал у сценах Белага дома была самай рознай: ад падтрымкі дзеянняў амерыканскага прэзідэнта да заўзятай антытрампаўскай рыторыкі.

Так, напрыклад, генеральны сакратар НАТА Марк Рутэ назваў сварку ў Белым доме «вартай шкадавання» і адзначыў, што Зяленскаму неабходна аднавіць стасункі з прэзідэнтам ЗША. У сваю чаргу прэзідэнт Бразіліі Лула да Сілва адзначыў, што словы Зяленскага на сустрэчы з Трампам наносяць шкоду Еўропе. «За ўсю гісторыю дыпламатыі» не было сцэны такой гратэскавай, такой непаважлівай, як тая, што мы назіралі ў Авальнай зале Белага дома», — падкрэсліў бразільскі прэзідэнт.

А вось значная частка еўрапейскіх палітыкаў хоць і была шакаваная тым, што адбылося ў Вашынгтоне, але падтрымала прэзідэнта Украіны. Прычым кіраўнік еўрадыпламатыі Кая Калас наогул у дачыненні да Трампа выказалася, што «свабоднаму свету патрэбны новы лідар».

### ФАРМІРАВАННЕ НОВАГА ЕЎРАПЕЙСКАГА ПАДЫХОДУ

Пасля правальнай сустрэчы ў Вашынгтоне Зяленскі адразу адправіўся ў Лондан да галоўнага бенефіцыяра канфлікту па падтрымку і атрыманне інструкцый аб далейшых дзеяннях. Туды ж, у Вялікабрытанію, сабраліся і некаторыя іншыя еўрапейскія палітыкі, каб абмеркаваць на пазачарговай сустрэчы фарміраванне антырасійскай кааліцыі, своеасаблівага Еўрапейскага падыходу. Бо пасля падзей у Белым доме стала гранічна зразумела, што ЗША выходзяць з украінскага канфлікту і пакідаюць еўрапейцаў сам-насам з Расіяй.

А ўлічваючы, што Еўропа прынцыпова не можа прайграць Пуціну, бо паставіла на кон не толькі свой аўтарытэт на міжнароднай арэне, але і ўклала ва Украіну на шкоду сваім эканомікам велізарныя фінансавыя сродкі і матэрыяльныя рэсурсы, то задача перамагчы Маскву ва ўкраінскім канфлікце з'яўляецца першараднай для еўрапейскіх эліт.

Таму ў Лондане і абмяркоўваліся ўзгодненыя дзеянні па павышэнні краінамі Еўропы ваенных выдаткаў да трох працэнтаў, стварэнне архітэктуры еўрапейскай бяспекі, пытанні, як сказаў прэзідэнт Францыі, звязаныя з адмовай ад «шчаслівай васалізацыі»


## Извещение о проведении повторных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Предмет торгов:**

**Лот № 1.** Капитальное строение, инвентарный номер 202/С-98299; наименование – ремонтная мастерская; назначение – здание специализированное иного назначения; год постройки – 1980, кол-во этажей – 2; пл. 1088,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Лиозненский район, Яськовщинский с/с, 16, вблизи аг. Надёжино. Техническое описание здания: фундамент – бетон; наружные, внутренние стены и перегородки – кирпичи; перекрытия – плита железобетонная; крыша (кровля) – асбестоцементный волнистый лист; полы – земля, доска, бетон, плитка; окна – дерево; двери, ворота – дерево, металл; внутренняя отделка – оштукатурено, отделка сайдингом, облицовка керамической плиткой, обшивка гипсокартонными листами; вентиляция с естественным побуждением; прочие – наружная (ые) лестница(цы). Здание расположено на земельном участке с кад. № 223084100001000022, пл. 3,5136 га; назначение – для строительства и обслуживания ремонтных мастерских. Договор аренды от 27.12.2023 г., до 27.12.2073 г. Ограничения (обременения) прав: на мелиорируемых (мелиорированных) землях – пл. 1,0976 га, в охранных зонах электрических сетей – пл. 0,0677 га, в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог – пл. 1,6795 га. Капитальное строение (незарегистрированное); наименование – гараж; назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, год постройки – 1980; кол-во этажей – 1, пл. 618,7 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Лиозненский район, Яськовщинский с/с, 16/3 вблизи аг. Надёжино. Техническое описание здания: фундамент – бетон; наружные; внутренние стены и перегородки – кирпичи; перекрытия – плита железобетонная; крыша (кровля) – рулонные материалы; полы – земля; вентиляция – с естественным побуждением; окна, двери, отделочные работы, инженерные системы, отопление, канализация, водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение – отсутствуют. Здание расположено на земельном участке с кад. № 223084100001000022, пл. 3,5136 га, назначение – для строительства и обслуживания ремонтных мастерских. Договор аренды от 27.12.2023 г., до 27.12.2073 г. Ограничения (обременения) прав: на мелиорируемых (мелиорированных) землях – пл. 1,0976 га, в охранных зонах электрических сетей – пл. 0,0677 га, в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог – пл. 1,6795 га. Капитальное строение (незарегистрированное), наименование – гараж; назначение – здание специализированное автомобильного транспорта; год постройки – 1980; кол-во этажей – 1; пл. 242,5 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Лиозненский район, Яськовщинский с/с, 16/4, вблизи аг. Надёжино. Техническое описание здания: фундамент – бетон; наружные, внутренние стены и перегородки – кирпичи; перекрытия – плита железобетонная; крыша (кровля) – рулонные материалы; полы – земля; окна – дерево; вентиляция – с естественным побуждением; двери, отделочные работы, инженерные системы, отопление, канализация, водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение – отсутствуют. Здание расположено на земельном участке с кад. № 223084100001000022, пл. 3,5136 га; назначение – для строительства и обслуживания ремонтных мастерских. Договор аренды от 27.12.2023 г., до 27.12.2073 г. Ограничения (обременения) прав: на мелиорируемых (мелиорированных) землях – пл. 1,0976 га, в охранных зонах электрических сетей – пл. 0,0677 га, в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог – пл. 1,6795 га. Капитальное строение (незарегистрированное); наименование – склад запасных частей; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ постройки 1980; кол-во этажей – 1; пл. 340,3 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Лиозненский район, Яськовщинский с/с, 16/5, вблизи аг. Надёжино. Техническое описание здания: фундамент – бетон; наружные, внутренние стены и перегородки – кирпичи; перекрытия – плита железобетонная; крыша (кровля) – асбестоцементный волнистый лист; полы – земля; окна – стеклоблоки, двери (ворота) – дерево, вентиляция с естественным побуждением; отделочные работы, инженерные системы, отопление, канализация, водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение – отсутствуют. Здание расположено на земельном участке с кад. № 223084100001000022, пл. 3,5136 га; назначение – для строительства и обслуживания ремонтных мастерских. Договор аренды от 27.12.2023 г., до 27.12.2073 г. Ограничения (обременения) прав: на мелиорируемых (мелиорированных) землях, пл. 1,0976 га, в охранных зонах электрических сетей – пл. 0,0677 га, в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог – пл. 1,6795 га. Капитальное строение (незарегистрированное); наименование – котельная, назначение – здание специализированное иного назначения; год постройки – 1980; кол-во этажей – 1; пл. 62,2 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Лиозненский район, Яськовщинский с/с, 16/1, вблизи аг. Надёжино. Техническое описание здания: фундамент – бетон; наружные, внутренние стены и перегородки – кирпичи; перекрытия – плита железобетонная; крыша (кровля) – рулонные материалы; полы – плитка, бетон; окна – дерево; двери (ворота) – дерево; внутренняя отделка – отделка сайдингом, облицовка керамической плиткой; отопление – котел на твердом топливе, электроснабжение – централизованная система, вентиляция с естественным побуждением; канализация, водоснабжение, газоснабжение – отсутствуют. Здание расположено на земельном участке с кад. № 223084100001000022, пл. 3,5136 га; назначение – для строительства и обслуживания ремонтных мастерских. Договор аренды от 27.12.2023 г., до 27.12.2073 г. Ограничения (обременения) прав: на мелиорируемых (мелиорированных) землях – пл. 1,0976 га, в охранных зонах электрических сетей – пл. 0,0677 га, в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог – пл. 1,6795 га.

**Нач. цена продажи имущества: 152 208 белорусских рубля и 00 копеек. Размер задатка: 15 220 белорусских рубля 80 копеек.**

**Условия:**

1. Участник аукциона, выигравший торги, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации необходимой для его проведения на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе предмета торгов не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен Управлением по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, но не более, чем на 20 рабочих дней. Оплата стоимости приобретенного на аукционе недвижимого имущества иностранными физическими и юридическими лицами осуществляется в установленном порядке за белорусские рубли или за иностранную валюту по официальному курсу белорусского рубля по отношению к иностранной валюте, установленному Национальным банком на дату платежа в соответствии с валютным законодательством.

2. Оформление документов и переход права собственности на приобретенный на аукционе предмет торгов осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона. На единственного участника распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5; тел. (0212) 24-63-12; e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 г. № 63.

Для участия в аукционе приглашаются резиденты РБ и нерезиденты РБ, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток, предоставили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона www.marketvit.by. **Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Аукцион состоится 19.03.2025 г. в 15.00** по адресу: 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок подачи заявления и документов: с 05.03.2025 г. в рабочие дни – с 08.30 до 17.30, по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 4).

Последний срок подачи заявления и прилагаемых к нему документов – **18.03.2025 г. до 17.30.**

Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с имеющейся документацией на предмет торгов, а также возможность осмотра предмета торгов на местности.

**Телефон для справок:**
**8 (0212) 24-63-12; 8 (029) 510-07-63.**

ў адносінах з ЗША», ну і, вядома ж, падтрымка праекта «Украіна» і дзе ўзяць грошы на рэалізацыю гэтага праекта.

Па выніках зборышча, на якое не запрасілі самых гучных русафобаў у Еўропе — краіны Прыбалтыкі і Малдову, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Стармер радасна паведаміў, што падвойвае падтрымку Кіева і дае яму... крэдыт (!) у памеры 2,2 млрд фунтаў стэрлінгаў, які забяспечваецца прыбыткам ад замарожаных расійскіх актываў.

Аднак прэм'ер-міністр Польшчы Туск быў больш стрыманы ў сваёй заяве, сказаўшы, што ва ўдзельнікаў саміту ў Лондане падзяліліся меркаванні наконт выкарыстання актываў РФ для фінансавання Кіева. «Некаторыя вельмі асцерагаюцца якіх-небудзь наступстваў — для еўра і банкаўскай сістэмы», — падкрэсліў Туск. І нядзіўна, што еўрапейскія краіны вагаюцца. Бо ў адказ на канфіскацыю (крадзеж) заходнімі краінамі расійскіх актываў Расія мае магчымасць не вяртаць сродкі еўрапейцаў, якія знаходзяцца ў РФ, а гэта таксама мільярды еўра. І калі Вялікабрытанія гатовая пайсці да апошняга ў супрацьстаянні з Расіяй, то Еўрасаюз да гэтага не гатовы. Бо інвестары могуць перадумаць і не тое, што спыняць інвестыцыі ў Еўропу, але і стануць актыўна выводзіць грошы і ўкладваць іх у тыя ж ЗША ці краіны глабальнага Поўдня. А гэта для еўрапейскага рынку смерці падобна. Да таго ж любыя сумесныя русафобскія, а цяпер і антыамерыканскія дзеянні еўрапейцаў могуць быць асуджаны на правал з-за двух адэкватных і рэалістычных палітыкаў — прэм'ер-міністраў Венгрыі Віктара Орбана і Славакіі Роберта Фіца, — якія цалкам могуць заблакіраваць любыя рашэнні ў рамках Еўрасаюза.

Дарэчы, па словах Віктара Орбана, вынікі саміту ў Лондане небяспечныя, бо брытанскія і еўрапейскія эліты вырашылі працягваць вайну на Украіне да апошняга ўкраінца.

**Сяргей ЧЫЧЫЛАЎ.**

ПРЫЯРЫТЭТЫ

# ПОПЛЕЧ НА ШЛЯХУ МАДЭРНІЗАЦЫІ

## Беларусь і Кітай сінхранізуюць стратэгіі развіцця






Для пашырэння беларуска-кітайскага супрацоўніцтва важна спалучаць узаемныя стратэгіі развіцця. Аб гэтым заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан Вэньчуань на VIII пленарным пасяджэнні Рэспубліканскай школы маладога кітаязнаўцы ў Рэспубліканскім інстытуце кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Як падкрэсліў кіраўнік дыпламатычнай місіі, на вялікім шляху мадэрнізацыі Кітай і Беларусь — спадарожнікі, якія ідуць поплеч. «На працягу 33 гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін дзве краіны заўсёды падтрымліваюць адна адну ў складанай міжнароднай абстаноўцы, пастаянна паглыбляюць палітычны ўзаемадавер на высокім узроўні, развіваюць усепагоднае міжнароднае супрацоўніцтва, прасоўваюць практычнае ўзаемадзеянне ў розных галінах, садзейнічаюць шматузроўневым сувязям паміж народамі, аказваюць дапамогу адзін аднаму ў дасягненні мэт нацыянальнай мадэрнізацыі», — адзначыў Чжан Вэньчуань.

Беларусь і Кітай распачынаюць новую главу плённага двухбаковага супрацоўніцтва. Цяпер спрыяльны час для таго, каб пашырыць узаемадзеянне. «Сёлета завяршаецца 14-я пяцігодка ў Кітаі, 2025-ы дае старт пяцігодцы якасці ў Беларусі, а таксама з'яўляецца пачаткам яе ўступлення ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва, — заўважыў пасол. — Краіны павінны скарыстацца гэтай магчымасцю, працаваць разам і садзейнічаць развіццю і адраджэнню адна адной».

14-я пяцігодка і пяцігодка якасці з'яўляюцца компасам і дарожнай картай для развіцця і адраджэння Кітая і Беларусі, што ў поўнай меры адлюстроўвае канцэпцыі, стратэгіі і мэты дзвюх краін у прасоўванні сацыяльна-эканамічнага развіцця, адзначыў кітайскі дыпламат. «Бакі павінны паглыбляць каардынацыю палітыкі і спалучэнне механізмаў, шукаць і вызначаць ключавыя галіны і пункты інтарэсаў, звязаных з працэсам мадэрнізацыі краін, такія як імпартазамяшчэнне, навукова-тэхнічныя інавацыі, аднаўляльныя крыніцы энергіі, лічбавая эканоміка і іншыя сферы, каб эфектыўна інтэграваць свае адпаведныя перавагі, фарміраваць узаемадапаўняльныя пункты, садзейнічаць аптымізацыі ўнутранага прамысловага ланцужка і ланцужка паставак, а таксама павысіць аўтаномнасць і ўстойлівасць эканамічнага развіцця», — заўважыў Чжан Вэньчуань.

Варта інтэнсіфікаваць практычнае супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю. «Бакам трэба паскорыць рэалізацыю Пагаднення аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый, увасабляць «Комплексную стратэгію сумеснага прамысловага развіцця», прыкласці сумесныя намаганні для садзейнічання высакаяснаму развіццю Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка, — адзначыў кітайскі дыпламат. — Важна актыўна прасоўваць сумесныя праекты ў рамках «Года супрацоўніцтва Кітая і Беларусі ў галіне навукі, тэхналогій і інавацый (2024—2025 гады)», заахвочваць стварэнне сумесных навукова-даследчых цэнтраў, лабараторый і іншых платформ, павялічваць інвестыцыі ў праекты навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, а таксама садзейнічаць сумеснай распрацоўцы і даследаванням новых тэхналогій у галіне штучнага інтэлекту і 5G. Акрамя таго, абодвум бакам трэба пашырыць супрацоўніцтва ў такіх гуманітарных галінах, як культура, адукацыя і турызм».

Неабходна пашыраць узаемавыгаднае супрацоўніцтва ў рамках ШАС. Як падкрэсліў Чжан Вэньчуань, афіцыйнае ўступленне Беларусі ў ШАС — не толькі новая веха ў гісторыі развіцця арганізацыі, але і адкрыццё новых магчымасцяў і шырокая пляцоўка для шматбаковага ўзаемадзеяння.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

**У тэму**

## Партнёрства на фоне глабальных эканамічных змяненняў

Стратэгічнае партнёрства паміж Беларуссю і Кітаем актыўна ўмацоўваецца на фоне глабальных эканамічных змяненняў. Гэта адзначыў **намеснік дырэктара НДЭІ Міністэрства эканомікі Аляксандр КУРЛЫПА**, перадае БелТА.

— Адносіны паміж Беларуссю і Кітаем перажываюць росквіт, стаўшы прыкладам паспяховага двухбаковага супрацоўніцтва, — падкрэсліў Аляксандр Курлыпа. — Наша краіна ўступіла ў новы прагнозны цыкл. Актыўна ідзе падрыхтоўка новых дакументаў доўгатэрміновага планавання і прагназавання на наступныя пяць гадоў і на перыяд да 2045-га. Ідзе работа над канцэпцыяй Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на наступныя пяць гадоў. Ва ўсіх гэтых дакументах важнае месца адводзіцца супрацоўніцтву з КНР. У прыватнасці, прадугледжваецца прадаўжэнне канструктыўнага дыялогу праз спалучэнне стратэгій сацыяльна-эканамічнага развіцця, пашырэнне гандлёва-эканамічных, тэхналагічных, інвестыцыйных, навукова-тэхнічных, адукацыйных, гуманітарных і іншых сувязяў».

Пры гэтым важная роля адводзіцца Кітайска-беларускаму індустрыяльнаму парку, які стане платформай для інвестыцыйнага і вытворчага супрацоўніцтва, што злучае еўрапейскія і азіяцкія рынкі «Аднаго пояса, аднаго шляху».


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА на 11.03.2025 г. в 11.00,

по адресу: 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. № 204, по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на **пять лет** для производственных целей (за исключением вредных производств), складских помещений, оказания услуг.

Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87

| Адрес арендуемого имущества | № Лота | Площадь, кв. м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, руб. | Размер задатка, руб. | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение, автоматическая телефонная станция – 5, 1 этаж, помещения, в т.ч. вспомогательное помещение (коридор), Гродненская обл., г. Гродно, ул. Репина, 38 | 1 | 189,5, в т.ч.: 181,8; 5,4; 2,3 | 2,0 | 841,38 | 841,38 | Помещения находятся на первом этаже двухэтажного железобетонного здания. В помещении имеется естественное освещение, отопление, электроснабжение. В здании имеется автономное отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,8 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Площади находятся в удовлетворительном состоянии, не используются с ноября 2024 г. |
| Изолированное помещение, помещение связи, 5 этаж, помещение, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пестрака, 36-11 | 2 | 35,9 | 2,0 | 159,40 | 159,40 | Помещение находится на пятом этаже пятиэтажного кирпичного здания. В здании имеется электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,1 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Помещение находится в удовлетворительном состоянии, не используется с ноября 2024 года |
| Изолированное помещение, помещение связи, 5 этаж, помещение, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пестрака, 36-11 | 3 | 26,9 | 2,0 | 119,44 | 119,44 | Помещение находится на пятом этаже пятиэтажного кирпичного здания. В здании имеется электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,1 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Помещение находится в удовлетворительном состоянии, не используется с ноября 2024 года |
| Изолированное помещение, помещение связи, 2 этаж, помещение, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пестрака, 36, пом. 7 | 4 | 16,2 | 2,0 | 71,93 | 71,93 | Помещение находится на втором этаже пятиэтажного кирпичного здания. В здании имеется электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,1 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Помещение находится в удовлетворительном состоянии, не используется с ноября 2024 года |

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 г. № 570, от 08.01.2013 г. № 16, от 12.07.2013 г. № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет BY16AKBB3012 0000400714000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBB BY2X, Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 г. № 570, от 08.01.2013 г. № 16, от 12.07.2013 г. № 607), в размере 15 % от начальной цены продажи соответствующего лота.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. 407, с 04.03.2025 до 10.03.2025 г. включительно, в рабочие дни (с 9.00 до 16.00).

Документы, поданные после 16.00 10.03.2025 г. не рассматриваются.

**Телефоны для справок:**
**(0152) 606805, (0152) 555138, факс (0152) 555139.**

СПОРТ-ТАЙМ

# КАНЬКАБЕЖЦЫ ПЕРАМАГАЛІ ДОМА, ЛЁГКААТЛЕТЫ БЫЛІ НАЙЛЕПШЫМІ Ў ГАСЦЯХ

## У традыцыйным аглядзе — спартыўныя навіны

**ГЕРАІНЯ ТЫДНЯ.** Беларуская спартсменка Васіліна Хандошка заваявала два медалі этапа Кубка свету па сінхронным плаванні ў Парыжы. Яе тэхнічную праграму суддзі ацанілі на 235,7242 бала, што прынесла Васіліне бронзавы медаль. У адвольнай праграме салістак з адзнакай 200,0726 бала беларуска заняла другое месца.





**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** 16 медалёў заваявалі беларусы на дамашнім Кубку мацнейшых па канькабежным спорце. Пераможцамі турніру сталі Ганна Дамарацкая (1000 м), Марына Зуева (3000 м), Ягор Дамарацкі (5000 м), Віктар Рудэнка (1500 м), а таксама жаночае трыа ў камандным спрынце. Ігнат Галавацюк заняў другое месца на дыстанцыях 500 і 1000 метраў і трэцяе месца ў мас-старце. Ягор Дамарацкі паказаў трэці вынік на дыстанцыі 1500 метраў, Ганна Дамарацкая таксама была трэцяй на гэтай дыстанцыі і заняла другое месца на дыстанцыі 500 метраў. Марына Зуева стала другой у мас-старце, Віктар Рудэнка паказаў трэці вынік на 1000 м. Беларуская мужчынская каманда ўзяла «серабро» ў спрынце, а ў абедзвюх камандных гонках праследавання нашы канькабежцы заваявалі бронзавыя медалі.

**СІЛА ТЫДНЯ.** Беларус Дзяніс Храмянкоў стаў прызёрам рэйтынгавага турніру па барацьбе памяці Мухамета Мала, які прайшоў у Албаніі. Дзяніс заняў трэцяе месца ў вагавой катэгорыі да 125 кг. Яшчэ адзін беларускі барэц Кірыл Маскевіч выйграў восьмы турнір прафесійнай барцоўскай лігі PWL. Кірыл Маскевіч стаў пераможцам турніру па грэка-рымскай барацьбе ў катэгорыі да 97 кг.

**МЕДАЛІ ТЫДНЯ.** Беларускія спартсмены паспяхова выступілі на першым этапе Кубка свету па сучасным пяціборстве 2025 года, які прайшоў у Каіры. Набраўшы ў суме 1445 ачкоў, Віялета Гурэева заняла другое месца. Анастасія Малашэнка набрала 1428 балаў, што прынесла ёй бронзавы медаль.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** Беларускія лёгкаатлеты выступілі на чэмпіянаце Расіі ў памяшканні. Пераможцам спаборніцтваў у штурханні ядра стала наша Алена Дубіцкая, у гэтым жа відзе праграмы ў мужчын першынстваваў Алег Тамашэвіч. На 60-метроўцы з бар'ерамі ў дзяўчат лепшай стала Эльвіра Грабарэнка, у хлопцаў на аналагічнай дыстанцыі Віталь Парахонька заняў трэцяе месца. У скачках з шастом найлепшым быў Мацвей Волкаў, які пабіў асабісты рэкорд, пераадолеўшы планку на вышыні 5,85 м. Найлепшым у сяміборстве стаў Максім Андралойць, які адзіны з усіх удзельнікаў набраў больш за 6000 ачкоў. Другі вынік у скачках у даўжыню паказаў Дзяніс Галух (7,80 м). Сярэбраны медаль у жаночым штурханні ядра заваявала Алена Трус. Яўген Брыгі заняў у гэтым відзе праграмы трэцяе месца. Яніна Луцэнка была трэцяй на дыстанцыі 60 метраў. У скачках у вышыню Карына Дзямідзік заняла трэцяе месца.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

НАДВОР'Е

# САПРАЎДНАЯ ВЯСНА

## У канцы тыдня прыгрэе да 17 градусаў

Як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, першы тыдзень каляндарнай вясны застанецца яшчэ зменлівым, калі ападкі будуць назірацца месцамі яшчэ з мокрым снегам. Аднак ноччу ўжо стане значна цяплей.

У аўторак умовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць цёплая вільготная паветраная маса. Воблачна з праясненнямі. Месцамі, пераважна па паўночнай палове краіны, пройдуць невялікія дажджы. Вецер заходні парывісты, ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі — моцны парывісты. Тэмпература паветра ноччу ўжо станоўчая ад плюс 1 да плюс 5 °С, а максімальная днём ад плюс 3 да плюс 9 °С, па паўднёвым захадзе Беларусі паветра прагрэецца да плюс 11 °С. Атмасферны ціск ноччу істотна не зменіцца, днём будзе слаба падаць.

Наступныя два дні (5 і 6 сакавіка) умовы надвор'я будуць вызначаць малаактыўныя франтальныя раздзелы і цёплыя паветраныя масы атлантычнага паходжання. Захаваецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. У сераду месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, а ўначы з мокрым снегам. Ноччу і раніцай па паўночным усходзе краіны на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Вецер заходні чвэрці парывісты, на большай частцы тэрыторыі краіны моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 1 да плюс 4 °С, максімальная днём — ад плюс 5 да плюс 12 °С.

У чацвер месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай па паўночным усходзе краіны на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Вецер заходні чвэрці парывісты, ноччу на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па краіне чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы ад нуля да плюс 6 °С, максімальная днём складзе ад плюс 7 °С па поўначы да плюс 15 °С па паўднёвым захадзе краіны.

У пятніцу будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай месцамі магчымыя слабыя туман і галалёд, па паўночным усходзе на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 °С, удзень — ад плюс 9 на поўначы да 17 °С цяпла на паўднёвым захадзе краіны.

У суботу (8 сакавіка) будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай месцамі магчымыя слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 °С, удзень — 9—16 °С цяпла.

У нядзелю таксама будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай месцамі магчымыя слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 °С. Удзень будзе ад плюс 7 на поўначы да плюс 15 °С на поўдні краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**






Фота Лізаветы ГОЛАД.

4 САКАВІКА Даты Падзеі Людзі




**1634** год — нарадзіўся (маёнтак Лышчыцы, цяпер у Брэсцкім раёне) Казімір Лышчынскі, беларускі мысліцель-атэіст і матэрыяліст, грамадскі дзеяч, педагог. Вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Брэсце, духоўнай акадэміі ў Кракаве. Працаваў выкладчыкам у Львове, памочнікам рэктара Брэсцкага езуіцкага калегіума, у школе, якую заснаваў у маёнтку Лышчыцы. Займаў пасады падстолія мельніцкага, памочніка суддзі Брэсцкага ваяводства, быў паслом у сейм ад Брэста. Займаўся навуковай, гаспадарчай, педагагічнай і грамадскай дзейнасцю. Светапогляд Лышчынскага фарміраваўся на аснове атэістычных і матэрыялістычных традыцый антычнай філасофіі і эпохі Адраджэння. У 1687 годзе за рукапісны трактат «Аб неіснаванні Бога» прызнаны атэістам і заключаны ў вязніцу. Сеймавы суд прыгаварыў Лышчынскага абезгаловіць і спаліць на вогнішчы. Пакараны смерцю ў Варшаве ў 1689 годзе.

**1782** год — нарадзіўся (в. Дудзічы, цяпер у Пухавіцкім раёне) Казімір Ельскі, беларускі скульптар. Вучыўся ў Віленскім універсітэце, Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. У 1811—1826 гадах загадваў кафедрай скульптуры Віленскага ўніверсітэта. Першы прафесар скульптуры ў Беларусі. У сваёй творчасці кіраваўся прынцыпамі класіцызму. Сярод работ: бюст князя А. Чартарыйскага, барэльеф «Смерць Барбары Радзівіл», партрэты.




**1880** год — у амерыканскай газеце «Нью-Ёрк Дэйлі Графік» апублікавана першая ў свеце рэпрадукцыя фатаграфіі.

**1933** год — інаўгурацыя Франкліна Дэлано Рузвельта ў якасці 32-га Прэзідэнта ЗША. Гэта была апошняя інаўгурацыя, якая адбылася ва ўстаноўлены Канстытуцыяй дзень, 4 сакавіка. Дваццатая папраўка да Канстытуцыі ЗША, прынятая ў студзені гэтага ж года, перанесла дзень інаўгурацыі на 20 студзеня. У выніку першы тэрмін паўнамоцтваў Рузвельта і віцэ-прэзідэнта Гарнера быў карацейшы за звычайны тэрмін на 43 дні.

**1944** год — пачалася Праскураўска-Чарнавіцкая наступальная аперацыя войскаў 1-га Украінскага фронту (Г. К. Жукаў) ва ўзаемадзеянні з войскамі 2-га Украінскага фронту (І. С. Конеў). Завяршылася 17 красавіка.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 235. Індэкс 63850. Зак. № 632.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 сакавіка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12